Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 220 (6196) | 22 верасня 1938 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Гісторыя Ўсесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў). Кароткі курс. Пад рэдакцыяй Камісіі ЦК ВКП(б). Адобран ЦК ВКП(б). 1938 год. Раздзел VI. Партыя большэвікоў у перыяд імперыялістычнай вайны. Другая рэволюцыя ў Расіі (1914 г.—сакавік 1917 г.).

У ЦК КП(б)Б.

Перадкастрычніцкае спаборніцтва прадпрыемстваў БССР.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ

Н. Вагнаў, Г. Золатцаў. — Авангардная роля комуністаў на тактычных вучэннях.

Падрыхтоўка да глыбокага вывучэння гісторыі ВКП(б).

У Менскім абкоме.

Падрыхтоўка прапагандысцкіх кадраў.

Семінар прапагандыстаў і агітатараў.

АРТЫКУЛЫ:

О. А. Гантман. — За ўзорны оперны тэатр.

Жанчыны авалодваюць тэхнікай кіравання лакаматывам.

ЗА РУБЯЖОМ

Выступленне тав. **М. М. Літвінава на пленуме** Лігі нацый.

Становішча ў Чэхаславакіі.

Чэхаславацкі ўрад прыняў англа-французскі ультыматум.

Узброеныя налёты генлейнаўскіх праваахтараў.

Імперыялістычны план расчлянення Чэхаславакіі.

Заява Нацыянальнага совета працы Англіі.

Дарэмныя спробы генерала Франко.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

ДАСТОИНА СУСТРЭНЕМ XXI ГАДАВІНУ КАСТРЫЧНІКА!

Паўтара месяца аддзяляе нас ад вялікага свята — XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Усе народы нашай вялікай неабсяжнай радзімы рыхтуюцца сустрэць слаўную гадавіну новымі перамогамі на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва.

Учора мы апублікавалі зварот калектыва рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў менскага станкабудаўнічага завода імя Кірава да ўсіх стахановцаў, ударнікаў, усіх рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў фабрык і заводаў Совецкай Беларусі.

У сваім звароце кіраўцы прапануюць разгарнуць социялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XXI гадавіны Кастрычніка Гэта прапанова, як нельга лепш, выражае пачуцці і імкненні рабочых, усіх працоўных Совецкай Беларусі.

Набліжэнне вялікага свята выклікае новы прыліў энтузіязма ў кожнага чэснага грамадзяніна краіны Совецкаў.

Сваю адданасць партыі Леніна — Сталіна гарачую любоў да радзімы кожны працоўны нашай рэспублікі як і ўсяго Совецкага Саюза, хоча адзначыць, асабліва ў гэтыя перадсвяточныя дні, — стахановскай работай, новымі дасягненнямі на прадпрыемстве, у калгасе, МТС, совецкай установе.

Выдатная ініцыятыва кіраўцаў з радасцю сустрэта ўсімі стахановцамі і ўдарнікамі усімі рабочымі, работніцамі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі прадпрыемстваў БССР.

Вялікі шлях барацьбы і перамог прайшла краіна Совецкаў пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і геніяльных правадыроў народа Леніна і Сталіна. У жорсткай барацьбе са шматлікімі ворагамі рэволюцыі ў нашай краіне пабудаван социялістычны лад, назаўсёды ліквідаваны эксплааператарскія класы, у небыцце адышла эксплаатацыя чалавека чалавекам. За дзве сталінскія пяцігодкі краіна Совецкаў ператварылася ў магутную індустрыяльную дзяржаву, у краіну самай перадавой социялістычнай сельскай гаспадаркі.

Дваццаць першую гадавіну Кастрычніка Совецкая Беларусь — неадрыўная частка вялікага СССР, магутны фарпост краіны социялізма на рубяжы з капіталістычным Захадам — сустракае вялікімі дасягненнямі на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва.

Дзякуючы Кастрычніцкай рэволюцыі і няўхільнаму ажыццяўленню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі Беларусь з былой адсталай і прыгнечанай поўкалоніі царскага самаўладдзя ператварылася ў перадавую індустрыяльна-калгасную ордэнаносную рэспубліку вялікага СССР. За гады сталінскіх пяцігодак у БССР пабудавана больш тысячы прамысловых прадпрыемстваў. Маленькія саматужныя майстэрні ўступілі сваё месца магутным заводам і фабрыкам, аснашчоным багатай социялістычнай тэхнікай.

Зусім па-новаму, заможна і культурна зажыла беларуская вёска. Калгасы нашай рэспублікі сабралі сёлета багаты сталінскі ўраджай, які на многа ўзніме кошт працадня. Гэтых перамог Совецкая Беларусь дабілася дзякуючы штодзённым клопатам аб беларускім народзе партыі Леніна—Сталіна, совецкага ўрада і асабіста любімага друга бацькі і настаўніка, правадыра народаў — таварыша Сталіна.

«Дастойна сустрэць вялікае свята, — пішуць у сваім звароце кіраўцы, — гэта значыць поўнасцю ліквідаваць сваю запазычанасць перад краінай, выканаць і перавыканаць вытворчыя праграмы, прыняць рашучыя меры да неадкладнай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, нястомна і да канца выкарчоўваць рэшткі трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай нечысці з нашых прадпрыемстваў і з усіх куткоў нашай совецкай зямлі.

Дастойна сустрэць вялікае свята — гэта значыць зрабіць усё неабходнае для ўкаранення стахановскіх метадаў работы, для ператварэння цэлых цэхаў прадпрыемстваў у суцэльна-стахановскія, арганізоўваючы шырокую перадачу вопыту лепшых стахановцаў астатнім рабочым».

У адпаведнасці з гэтымі задачамі перадкастрычніцкага спаборніцтва, кіраўцы ўзялі на сябе рад сур'ёзных самаабавязацельстваў: выканаць гадавую вытворчую праграму па заводу ў цэлым да 12 снежня — гадавіны выбараў у Вярхоўны Совет СССР, а па кавальскаму цэху — да 7 лістапада. Да XXI гадавіны Кастрычніка асвоіць выраб раду новых складаных станкоў, даць звыш плана на 225 тысяч рублёў прадукцыі шырокага спажывання, арганізаваць шырокі абмен вопытам стахановскай работы, палепшыць абаронную работу на заводзе і т. д. Як і ўсе інжынерна-тэхнічныя работнікі прадпрыемстваў БССР кіраўцы пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі будуць змагацца за ператварэнне кожнага цэха і ўсяго завода ў суцэльна-стахановскі.

Іменна так павінны паступіць рабочыя калектывы і кіраўнікі кожнага прадпрыемства уступаючы ў спаборніцтва на дастойную сустрэчу XXI гадавіны Кастрычніка.

На падставе ініцыятывы і прапаноў лепшых стахановцаў, ударнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў дырэктары, партыйныя і профсаюзныя арганізацыі кожнага прадпрыемства павінны распрацаваць канкрэтныя прадуманыя і рэальныя самаабавязацельствы і змагацца за іх безумоўнае выкананне шляхам арганізацыі дзейснага спаборніцтва ўсіх рабочых, кожнай змены, цэха, прадпрыемстваў аднаго з адным.

Прамысловасць нашай рэспублікі працуе ў гэтым годзе ўсё яшчэ нездавальняюча. За тры кварталы гэтага года краіне недадана на дзесяткі мільёнаў рублёў прадукцыі. Асабліва дрэнна працуюць такія прадпрыемствы, як магілёўскі трубаліцейны завод, гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат імя Ежова, аршанскі ільнакамбінат і іншыя прадпрыемствы.

У чым прычыны гэтай дрэннай работы?

Першая і самая галоўная прычына заключаецца ў тым, што дырэктары, партыйныя арганізацыі раду прадпрыемстваў і трэстаў не ўзяліся па-большэвіцку за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў. Так, напрыклад, кіраўнікі менскага станкабудаўнічага завода імя Варашылава, як відаць, не зразумелі, што іх праграмы абавязак наладзіць выпуск станкоў, выраб якіх зрывалі шкоднікі.

Партыя і ўрад патрабуюць рашучых і дзейсных мер па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва. На кожным прадпрыемстве, у кожным трэсце павінен быць распрацаван канкрэтны план мерапрыемстваў у гэтым напрамку — гэта галоўная ўмова ліквідацыі адставання ў прамысловасці.

Другая прычына нездавальняючай работы многіх прадпрыемстваў крыецца ў недастатковай увазе кіраўнікоў да разгортвання стахановскага руху.

Стахановскі рух усё больш і больш шырыцца на нашых прадпрыемствах. Ламаючы ўсякія рагаткі, авалодваючы ў дасканаласці тэхнікай вытворчасці, стахановцы паказваюць высокія ўзоры прадукцыйнасці працы. Наша задача, задача гаспадарнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў—дапамагчы стахановцам перайсці да больш глыбокай мабілізацыі рэзерваў кожнага станка, агрэгата, усяго прадпрыемства.

Кіраўцы ў сваім звароце зусім правільна заклікаюць гаспадарнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў арганізаваць шырокую дапамогу стахановцам, стварыць ім усе ўмовы для выканання сваіх абавязацельстваў у перадкастрычніцкім спаборніцтве. Неабходна арганізаваць таксама перадачу вопыту лепшых стахановцаў усім астатнім рабочым.

Важнейшай задачай кожнага прадпрыемства з'яўляецца ўзорная падрыхтоўка да зімы. Гэта павінна быць састаўной часткай перадкастрычніцкага спаборніцтва. Максімум увагі і энергіі неабходна аддаць таксама пашырэнню выраба прадметаў шырокага спажывання.

Таварышы рабочыя і работніцы, стахановцы і ўдарнікі, інжынерна-тэхнічныя работнікі! Разгорнем перадкастрычніцкае спаборніцтва, уславім нашу дарагую радзіму новымі стахановскімі перамогамі і тым самым яшчэ больш умацуем яе сілу і магутнасць.

У ЦК КП(б)Б

20 верасня ў ЦК КП(б)Б адбылася нарада работнікаў рэспубліканскага друку, рэдактараў абласных газет і работнікаў аддзелаў друку абкомаў партыі. Нараду праводзіў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. П. К. Панамарэнка.

У сваім выступленні на нарадзе тав. Панамарэнка ўказаў на асобныя памылкі і недахопы, якія маюць месца ў рабоце рэспубліканскіх і абласных газет, і патрабаваў хутчэйшага іх знішчэння. Падрабязна спыняючыся на чарговых задачах КП(б)Б і большэвіцкага друку, тав. Панамарэнка звярнуў увагу работнікаў газет на неабходнасць яшчэ большага павышэння рэволюцыйнай пільнасці, чуткасці, умацавання сувязей і зносін з масамі, з партыйным актывам, а таксама паляпшэння якасці асвятлення пытанняў партыйнага жыцця ў адпаведнасці з рашэннямі ЦК ВКП(б).

Абмеркаваўшы рад бягучых пытанняў работы рэспубліканскіх, абласных і раённых газет, нарада скончыла сваю работу.

НА ПЛЕНУМЕ ЛІГІ НАЦЫЙ

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. М. М. ЛІТВІНАВА

ЖЭНЕВА, 21 верасня. (БЕЛТА). Сёння раніцай на пленуме Лігі нацый з вялікай прамоваю выступіў народны камісар замежных спраў СССР тав. М. М. Літвінаў.

Тав. Літвінаў у пачатку сваёй прамовы ўказаў на тое, што выступаўшыя на пленуме Лігі па гадавой справаздачы Лігі нацый прамоўцы гаварылі, галоўным чынам, аб тым, чаго Ліга не зрабіла, бо, як відаць, усе ўсведамляюць, што Ліга нацый не была створана для той дзейнасці, аб якой гаворыць справаздача генеральнага сакратара Лігі. Ліга нацый была створана пасля сусветнай вайны для таго, каб зрабіць гэтую вайну апошняй, ахоўваць усе народы ад агрэсіі і замяніць сістэму ваенных саюзаў калектыўнай арганізацыяй дапамогі афярам агрэсіі. Між тым у гэтай галіне Ліга нічога не зрабіла. Абісінія і Аўстрыя падпарадкаваны грубаму насіллю і страцілі сваю незалежнасць. Кітай стаў афярай агрэсіі, Іспанія ўжо трэці год спякае крывёю ў рэзультаце замежнай інтэрвенцыі. Цяпер пятая дзяржава — Чэхаславакія знаходзіцца пад пагрозай адкрытай абвешчанай агрэсіі.

Далей тав. Літвінаў напомніў аб актыўнай ролі, якую адыгрывала Чэхаславакія і яе цяперашні прэзідэнт Бенеш у арганізацыі і развіцці Лігі нацый, а таксама аб тым, што сімпатыі ўсіх народаў, прадстаўленых на пленуме, накіраваны да чэхаславацкага народа. Між тым чэхаславацкае пытанне нават не стаіць у парадку дня пленума Лігі нацый.

Спыніўшыся на нападках на статут Лігі нацый, тав. Літвінаў указаў, што ўлюбёным аргументам праціўнікаў захавання ў недатыкальнасці статута Лігі з'яўляецца спасыланне на адсутнасць універсалізма. Між тым Ліга ў першыя 12 год свайго існавання не была універсальна. Затым некаторыя дзяржавы яе пакідалі, другія прыходзілі, аднак нікому не прыходзіла ў галаву сумнявацца ў тым, што Ліга павінна выконваць свае асноўныя задачы па ахове міру. Нават у сваім цяперашнім саставе Ліга нацый яшчэ даволі моцна, каб калектыўнымі дзеяннямі папярэдзіць ці спыніць агрэсію. Для гэтага патрэбна толькі добрая воля ўваходзячых у Лігу дзяржаў. За скаргамі на адсутнасць універсальнасці Лігі на самай справе выглядаюць зусім іншага роду разважанні. Пры стварэнні Лігі нацый не думалі, што зкойдуцца дзяржавы, якія стануць на шлях агрэсіі, і што з'явіцца неабходнасць на справе прымяніць 10 і 16 артыкулы статута Лігі. Цяпер, калі агрэсія стала рэальнасцю, то, відавочна, для ўстаранення ўсякага ўласнага рыску хочуць устараніць калектыўныя сродкі барацьбы з агрэсіяй.

Дзякуючы палітыцы патурання агрэсарам, агрэсія высока падняла сваю галаву, і сілы яе растуць з кожным днём. Агрэсіўныя дзяржавы за апошнія тры годы выраслі і стварылі блок у імя абароны прынцыпу агрэсіі. Але яны і цяпер яшчэ слабей магчымага блоку міралюбівых дзяржаў. Палітыка непраціўлення злу і заахвочвання агрэсараў, якую прапануюць праціўнікі санкцый, не будзе мець іншых рэзультатаў, апрача далейшага ўмацавання і пашырэння сіл агрэсіі.

У Лігі нацый і па-за ёю намеціліся дзве тэндэнцыі, дзве канцэпцыі захавання міру. Адна канцэпцыя абараняе той пункт гледжання, што Ліга нацый, а таксама асобныя члены Лігі павінны ўсімі наяўнымі ў іх распараджэнні сродкамі аказаць рашучае супраціўленне агрэсару. У выпадку агрэсіі супроць агрэсара павінен быць прыменен 16 артыкул рашуча, паслядоўна і без усякіх хістанняў. Другая канцэпцыя вышэйшай мудрасцю лічыць заахвочванне агрэсара, вядзенне з ім перагавораў, заключэнне з ім кампрамісных пагадненняў. Гэта палітыка мела вынікам тры вайны і пагражае ўцягнуць нас у чацвертую.

Далей тав. Літвінаў падрабязна спыняецца на значэнні прынцыпу абавязковасці прымянення ўсімі членамі Лігі артыкула 16 статута. Тав. Літвінаў задае пытанне: калі з прынцыпаў Лігі нацый устраняецца прынцып калектыўнай бязапаснасці, то якім-жа іншым прынцыпам Лігі выступаўшыя тут абяцаюць сваю адданасць? Рашэнням Лігі па барацьбе з наркоцікамі? Устанаўленню міжнародных сігналаў на перакрыжаваннях? Але для вырашэння ўсіх гэтых пытанняў не трэба было ствараць Лігу.

Памылковасць і шкоднасць рашэнняў, прынятых некаторымі дзяржавамі, аб неабавязковасці артыкула 16, для ўсяго чалавецтва і ў першую чаргу для тых дзяржаў, якія абараняюць гэтыя рашэнні, пакажа гісторыя. Совецкі ўрад ні ў малейшай меры не вінаваты ў адбываючыхся падзеях і ў тым што за гэтым можа фатальна паследаваць. Совецкі Саюз пасля доўгіх хістанняў і сумненняў прышоў у Лігу, каб далучыць магутнасць 170-мільённага народа да сіл міру. Ён не шкадуе аб гэтым, хоць-бы таму, што іракш несумненна рабіліся-б спробы яго адсутнасці прыпісваць мнімае бяссілле і крах Лігі. Совецкі Саюз быў нязменна верны прынятым на сябе абавязацельствам і лаяльна выконваў усе рашэнні і нават рэкамендацыі Лігі, меўшыя мэтаю захаванне міру і барацьбу з агрэсарамі, не лічачыся з тым, ці супадалі гэтыя рашэнні з яго дзяржаўнымі інтарэсамі гэтага дня. Такія былі яго паводзіны пры нападзе Італіі на Абісінію. Совецкая далегацыя заўсёды настойвала на выкананні Лігай свайго абавязка перад Іспаніяй, і не яе віна, што іспанская праблема была ізята з Лігі і перадана ў Лонданскі камітэт па неўмяшанню, які бачыць сваю задачу ў тым, каб не перашкаджаць умяшанню агрэсіўных краін у іспанскія справы. У адносінах кітайскай праблемы совецкая далегацыя таксама заўсёды настойвала на аказанні Лігай нацый максімальнага падтрымання афярам японскай агрэсіі, і тыя скромныя рэкамендацыі, якія Ліга нацый прыняла, совецкі ўрад выконвае больш чым лаяльна.

Такая падзея, як знікненне аўстрыйскай дзяржавы, прайшла незаўважанай для Лігі нацый.

Усведамляючы значэнне, якое гэта падзея павінна мець для лёсу усёй Еўропы і ў першую чаргу для Чэхаславакіі, совецкі ўрад зараз-жа пасля захвату Аўстрыі афіцыяльна звярнуўся да іншых вялікіх еўрапейскіх дзяржаў з прапановаю аб неадкладным абмеркаванні магчымых вынікаў гэтай падзеі з мэтаю прыняцця калектыўных папераджальных мер. На жаль, гэтая прапанова не была ацэнена па дастоінству. Звязаны з Чэхаславакіяй пактам аб узаемнай дапамозе Совецкі Саюз устрымліваўся ад усякага ўмяшання ў перагаворы чэхаславацкага ўрада з судэтанемцамі, лічачы недапушчальным патрабаваць ад чэхаславацкага ўрада ўступак немцам на шкоду дзяржаўным інтарэсам, дзеля пазбаўлення яго ад неабходнасці выканання сваіх абавязацельстваў па пакту.

Далей тав. Літвінаў указвае, што калі за некалькі дзён да яго ад'езду ў Жэневу французскі ўрад у першы раз звярнуўся да СССР з запросам аб яго пазіцыі ў выпадку нападу на Чэхаславакію, то ён ад імя Совецкага ўрада даў зусім чоткі і непрухсэнсоўны адказ, а іменна, што СССР намеран выканаць свае абавязацельствы па пакту і разам з Францыяй аказаць дапамогу Чэхаславакіі ўсімі даступнымі шляхамі. Таксама было ўказана, што ваеннае ведамства СССР гатова неадкладна прыняць удзел у нарадзе з прадстаўнікамі французскага і чэхаславацкага ваенных ведамстваў для абмеркавання мерапрыемстваў, дыктуемых момантам. Таксама было ўказана на пажаданасць пастаноўкі пытання ў Лізе нацый пакуль хоць аб артыкуле 11 з мэтаю мабілізацыі грамадскай думкі і выяснення пазіцыі некаторых іншых дзяржаў, пазіўная дапамога якіх была-б вельмі каштоўнай. Мы прапаноўвалі, разам з тым, вычарпаць усе меры прадухілення ўзброенага канфлікту і з гэтай мэтаю прапаноўвалі неадкладнае скліканне нарады еўрапейскіх дзяржаў і іншых зацікаўленых дзяржаў для магчымай выпрацоўкі калектыўнага дэмарша.

Калі чэхаславацкі ўрад трэцяга дня ўпершыню запрасіў совецкі ўрад, ці гатоў ён у адпаведнасці з пактам аб узаемнай дапамозе аказаць неадкладную і дзейсную дапамогу Чэхаславакіі ў выпадку, калі Францыя, верная сваім абавязацельствам, акажа такую-ж дапамогу, то і на гэта совецкі ўрад даў зусім ясны і станоўчы адказ. Не наша віна, калі нашым прапановам не быў дадзен ход.

Я ўпэўнен, гаворыць тав. Літвінаў, што гэтыя прапановы маглі даць пажаданыя рэзультаты як у інтарэсах Чэхаславакіі, так і ўсёй Еўропы і ўсеагульнага міру. На жаль, былі прыняты іншыя меры, якія прывялі і не маглі не прывесці да такой капітуляцыі, якая рана ці позна будзе мець вусім неасяжныя катастрафічныя вынікі.

Уникнуць праблематычнай вайны сёння і атрымаць новую ўсёахопліваючую вайну заўтра ды яшчэ паною задаволення апетытаў ненасытных агрэсараў, знішчэння і скалечання суверэнных дзяржаў—не значыць дзейнічаць у духу пакта Лігі нацый. Прэміраваць брагання зброяй і зварот да зброі для вырашэння міжнародных праблем, інакш кажучы—прэміраваць і заахвочваць наступальны звышімперыялізм у дагэтуль нечуваных формах—не значыць дзейнічаць у духу пакта Келога—Брыяна.

Совецкі ўрад, які ганарыцца сваёй непрычаснасцю да такой палітыкі і які нязменна следаваў прынцыпам гэтых двух пактаў, адобраных амаль усімі народамі свету, не будзе і надалей адступаць ад іх, упэўнены ў тым, што ў сучасных умовах немагчыма іншым шляхам забяспечыць сапраўдны мір і сапраўдную міжнародную справядлівасць. Вярнуцца на гэты шлях ён кліча і іншыя ўрады.

Канец прамовы тав. Літвінава быў пакрыт апладысментамі.

СТАНОВІШЧА Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 21 верасня. (БЕЛТА). З паінфармаваных крыніц паведамляюць, што сёння ў 2 гадзіны ночы, праз некалькі гадзін пасля ўручэння французскаму і англійскаму пасланнікам адказу чэхаславацкага ўрада па поваду англа-французскіх прапаноў, англійскі пасланнік Ньютон і французскі — дэ Лакруа з'явіліся да прэзідэнта Бенеша і паведамілі, што іх урады незадаволены адказам Прагі. Пасланнікі Францыі і Англіі заявілі, што ў выпадку адмовы Чэхаславакіі прыняць англа-французскія прапановы паследуе неадкладны напад Германіі, і ў гэтым выпадку Англія і Францыя не акажуць Чэхаславакіі дапамогі. Пасланнікі намякнулі, што адначасова супроць Чэхаславакіі выступяць таксама Венгрыя і Польшча. Кабінет міністраў засядаў усю ноч. Адначасова засядаў пастаянны парламенцкі камітэт.

ЧЭХАСЛАВАЦКІ ЎРАД ПРЫНЯЎ АНГЛА-ФРАНЦУЗСКІ ЎЛЬТЫМАТУМ

ПРАГА, 21 верасня. (БЕЛТА). Сёння вечарам Чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва апублікавала афіцыяльнае паведамленне аб прыняцці чэхаславацкім урадам англа-французскага ультыматума. Прыняцце ультыматума матывуецца адмаўленнем Францыі і Англіі аказаць Чэхаславакіі дапамогу ў выпадку ваеннага нападу на яе Германіі, Венгрыі і Польшчы.

Чэхаславацкая нота аб прыняцці ультыматума перадана сёння вечарам Францыі і Англіі.

Паведамленне аб прынятым чэхаславацкім урадам рашэнні выклікала велізарнае ўзбуджэнне ва ўсёй краіне. У Празе адбываюцца масавыя стыхійныя дэманстрацыі пратэсту.

ДАРЭМНЫЯ СПРОБЫ ГЕНЕРАЛА ФРАНКО

ЛОНДАН, 21 верасня. (БЕЛТА). Газета «Манчэстэр гардыян», гаворачы ў перадавым артыкуле аб становішчы на фронце Эбро, піша, што спробы генерала Франко адкінуць рэспубліканскія войскі назад на левы бераг ракі Эбро не ўвянчаліся поспехам. У рэзультаце канцэнтрацыі вялікіх сіл на фронце Эбро, наступіла амаль поўнае зацішша на іншых франтах у Іспаніі. Зараз ужо нічога не чуваць аб наступленні мяцежнікаў на Валенсію. Рашучы контрудар рэспубліканскіх войск паклаў канец наступленню мяцежнікаў у горах Альмадэна. На фронце Эбро, прадаўжае газета, дзейнічае 150-тысячная армія мяцежнікаў, у складзе якой ёсць некалькі італьянскіх дывізій. Гэта армія мае навейшую германскую артылерыю і лепшыя самалёты інтэрвентаў. Аднак упорнае супраціўленне рэспубліканцаў робіць «поспехі» арміі генерала Франко мізэрнымі.

На працягу двух месяцаў ваенных дзеянняў на фронце Эбро мяцежнікі страцілі каля 100 самалётаў. Судзячы па гэтых даных, можна ўявіць сабе велізарнейшыя размеры замежнай дапамогі мяцежнікам.

На фронце Эбро, піша ў заключэнне газета, рэспубліканцы з гранічнай ясцасцю паказалі, што мяцежнікі былі-б даўно ліквідаваны, калі-б яны не атрымлівалі дапамогі ад Германіі і Італіі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

Японскае наступленне ад Цзюцзяна ідзе ўздоўж аболвух берагоў Янцзы ў бок Ханькоу і на поўдзень уздоўж чыгункі на Наньчан, праследуючы мэту перарэзаць Кантон-Ханькоускую чыгунку. Пад агнём кітайскіх батарэй японцы вымушаны былі пакінуць вышыню Гуйчунсі і іншыя паблізу ляжачыя пункты ў гэтым сектары. На поўнач ад Сікуліна (на захад ад Наньканя) узвод японскіх салдат, які вёў разведку, быў цалкам знішчан атрадам кітайскіх войск. У рэзультаце гэтай сутычкі кітайцы забілі 40 японскіх салдат і захвацілі 34 вінтоўкі і 3 кулямёты.

У сектары Жуйчан (на захад ад Цзюцзяна) кітайскія войскі 19 верасня раптоўнай атакай выбілі японцаў з раду пунктаў. У часе атакі кітайцы ўзялі ў палон 2 афіцэраў і 20 салдат і захвацілі 100 коней і некалькі палявых гармат.

19 верасня 4 японскія самалёты на паўднёвы захад ад Жуйчана скінулі хімічныя бомбы на кітайскія пазіцыі. Сярод кітайскіх войск ёсць вялікія страты.

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СПАБОРНІЦТВА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР

У АДКАЗ НА ЗВАРОТ КІРАЎЦАЎ

З вялікай актыўнасцю адгукнуўся калектыў рабочых швейнай фабрыкі імя Крупскай (Менск) на зварот кіраўцаў. Учора па гэтаму пытанню на фабрыцы адбыўся агульны сход рабочых. На сходзе прысутнічала звыш 600 чалавек.

У вынесеным рашэнні рабочыя і работніцы фабрыкі абавязаліся да XXI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі выпусціць звыш плана прадукцыі на 501,5 тыс. рублёў, правесці грамадскі агляд фабрычнага абсталявання, на 1,5 процанта супроць устаноўленага плана знізіць сабекошт выпускаемай прадукцыі, адкрыць школу па перадачы стахановскіх метадаў работы. Гадавую вытворчую праграму рабочыя абавязаліся выканаць да гадавіны выбараў Вярхоўнага Совета СССР — 12 снежня.

Да XXI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі на фабрыцы арганізуецца фота-вітрына лепшых стахановцаў. Адпушчана 8 тыс. рублёў для рамонту 50 кватэр рабочых.

На гэтым-жа сходзе калектыў фабрыкі прыняў выклік на социялістычнае спаборніцтва рабочых галантарэйнай фабрыкі імя Фрунзе.

ВЫКОНВАЮЦЬ СВАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

З вялікім уздымам узяўся калектыў рабочых менскага станкабудаўнічага завода імя Кірава за выкананне абавязацельстваў, узятых ім у сваім звароце да ўсіх рабочых Совецкай Беларусі.

Учора ля кожнага станка былі вывешаны ўзятыя кожным рабочым абавязацельствы з указаннем, хто з кім спаборнічае.

Многія стахановцы, выконваючы свае абавязацельствы, дасягнулі высокай прадукцыйнасці працы. Так, токар новамеханічнага цэха тав. Лапін выканаў норму на 295 проц., токар Гардзеенка — на 195 проц. Брыгада кавалёў (брыгадзір тав. Аўлашчык) выканала норму на 250 проц. Слёсар тав. Пашкевіч — на 265 проц., слёсар тав. Руды — на 250 проц.

Г. ЛАПІДУС.

УКЛЮЧЫЛІСЯ У СОЦСПАБОРНІЦТВА

У цэхах галантарэйнай фабрыкі імя Фрунзе ўчора адбыліся сходы рабочых, на якіх абмяркоўваўся зварот кіраўцаў аб дастойнай сустрэчы XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі.

У прынятых рашэннях рабочыя абавязваюцца выканаць гадавы план да 12 снежня — гадавіны выбараў у Вярхоўны Совет СССР, знізіць сабекошт прадукцыі на 1,5 проц. супроць устаноўленага плана.

На фабрыцы разгарнулася спаборніцтва паміж цэхамі, брыгадамі і асобнымі рабочымі. Рабочыя цэха па вырабу палатняных гузікаў выклікалі на соцспаборніцтва рабочых цэха плацяных гузікаў. Калектыў фабрыкі выклікаў на социялістычнае спаборніцтва менскую швейную фабрыку імя Крупскай.

УЗОРЫ ВЫСОКАЙ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ПРАЦЫ

Сярод рабочых вагоннага цэха гомельскага паравозарамонтнага завода шырока разгарнулася социялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. У цэнтры ўвагі — выкананне загада наркома аб падрыхтоўцы да зімы.

Рабочыя вагоннага цэха паставілі пытанне перад вагонарамонтным трэстам аб павелічэнні месячнай праграмы на 15 вагонаў. Патрабаванне рабочага калектыва задаволена. На працягу верасня павышаная праграма цэхам з дня ў дзень паспяхова выконваецца.

Лепшыя стахановцы цэха даюць высокія ўзоры прадукцыйнасці працы. Столяр Бадуноў па вырабу ўнутраных дзвярэй для вагонаў штодзённа выконвае сваю норму на 423 проц., тав. Купэнка — на 402 проц. Слёсар тав. Пікуль выконвае сваю норму на 275 процантаў. Брыгада тав. Вірэнчыкава Васіля па лакіроўцы рам і мэблі для вагонаў выконвае сваю норму на 175 проц.

ГІСТОРЫЯ

Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)

Пад рэдакцыяй Камісіі ЦК ВКП(б). КАРОТКІ КУРС. *Адобран ЦК ВКП(б). 1938 год.*

РАЗДЗЕЛ VI

ПАРТЫЯ БОЛЬШЭВІКОЎ У ПЕРЫЯД ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ. ДРУГАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ Ў РАСІІ. (1914 г. — САКАВІК 1917 г.).

1. УЗНІКНЕННЕ І ПРЫЧЫНЫ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ.

14 (27) ліпеня 1914 года царскі ўрад абвясціў усеагульную мабілізацыю 19 ліпеня (1 жніўня) Германія абвясціла вайну Расіі.

Расія ўступіла ў вайну.

Яшчэ задоўга да пачатку вайны Ленін, большэвікі прадбачылі яе немінучасць. На міжнародных з'ездах соцыялістаў Ленін выступаў са сваімі прапановамі, накіраванымі да таго каб вызначыць рэволюцыйную лінію паводзін соцыялістаў у выпадку ўзнікнення вайны.

Ленін указваў, што войны — немінучы спадарожнік капіталізма. Грабеж чужых зямель, заваяванне і аграбленне калоній, захват новых рынкаў не раз служылі прычынай заваёўніцкіх войн капіталістычных дзяржаў. Вайна для капіталістычных краін з'яўляецца такім-жа натуральным і законным станам, як эксплаатацыя рабочага класа.

У асаблівасці войны сталі немінучы, калі капіталізм у канцы XIX і ў пачатку XX века канчаткова перарос у вышэйшую і апошнюю ступень свайго развіцця — імперыялізм. Пры імперыялізме набылі рашаючую ролю ў жыцці капіталістычных дзяржаў магутныя аб'яднанні (манаполіі) капіталістаў і банкі. Фінансавы капітал стаў гаспадаром у капіталістычных дзяржавах. Фінансавы капітал патрабаваў новых рынкаў, захвату новых калоній, новых месц для вывазу капітала, новых крыніц сыравіны.

Але ўжо ў канцы XIX века ўся тэрыторыя зямнога шара аказалася падзеленай паміж капіталістычнымі дзяржавамі. Між тым развіццё капіталізма ў эпоху імперыялізма адбываецца надзвычай няроўнамерна і скачкападобна: адны краіны, якія раней былі на першым месцы, развіваюць сваю прамысловасць цараўнальна павольна, другія, якія раней былі адсталымі, быстрымі скачкамі наганяюць і перагоняюць іх. Змяняліся суадносіны эканамічных і ваенных сіл імперыялістычных дзяржаў. Паяўлялася імкненне да новага перадзелу свету. Барацьба за новы перадзел свету выклікала немінучасць імперыялістычнай вайны. Вайна 1914 года была вайной за перадзел свету і сферы ўплыву. Яна заложена падрыхтоўвалася ўсімі імперыялістычнымі дзяржавамі. Яе віноўнікі — імперыялісты ўсіх краін.

У асаблівасці-ж гэтая вайна падрыхтоўвалася Германіяй і Аўстрыяй з аднаго боку, Францыяй, Англіяй і залежнай ад іх Расіяй — з другога. У 1907 годзе ўзнікла Тройная згода або Антанта, — саюз Англіі, Францыі і Расіі. Другі імперыялістычны саюз складалі Германія, Аўстра-Венгрыя і Італія. Але Італія ў пачатку вайны 1914 года вышла з гэтага саюза, а затым далучылася да Антанты Германію і Аўстра-Венгрыю падтрымлівалі Балгарыя і Турцыя.

Падрыхтоўваючыся да імперыялістычнай вайны, Германія імкнулася адабраць у Англіі і Францыі калоніі, у Расіі — Украіну, Польшчу, Прыбалтыку. Германія пагражала панаванню Англіі на Бліжнім Усходзе, пабудаваўшы Багдадскую чыгунку. Англія баялася росту марскіх узбраенняў Германіі.

Царская Расія імкнулася да раздзелу Турцыі, марыла аб заваяванні праліваў з Чорнага мора к Міжземнаму мору (Дарданелы), аб захвале Канстанцінопаля. У планы царскага ўрада ўваходзілі таксама захват Галіцыі — часткі Аўстра-Венгрыі.

Англія імкнулася пры дапамозе вайны разбіць свайго небяспечнага канкурэнта — Германію, тавары якой перад вайной сталі ўсё больш выцясняць англійскія тавары на сусветным рынку. Апрача таго, Англія намеравалася захапіць у Турцыі Месапатамію Палесціну і цвёрда абасноваецца ў Егіпце.

Французскія капіталісты імкнуліся захапіць у Германіі багатыя вугалем і жалезам Саарскі басейн і Эльзас-Лятарынгію, якая была адабрана Германіяй у Францыі ў вайне 1870—1871 гадоў.

Такім чынам, да імперыялістычнай вайны прывялі буйнейшыя супярэчнасці паміж двума групамі капіталістычных дзяржаў.

Гэтая грабежніцкая вайна за перадзел свету закранала інтарэсы ўсіх імперыялістычных краін і таму ў яе аказаліся ў далейшым уцягнутымі Японія. Злучаныя Штаты Амерыкі і рад іншых дзяржаў.

Вайна стала сусветнай.

Імперыялістычная вайна падрыхтоўвалася буржуазіяй у глыбокай тайне ад сваіх народаў. Калі вайна выбухнула, кожны імперыялістычны ўрад стараўся даказаць, што не ён напаў на суседзяў, а на яго напалі. Буржуазія абманвала народ, скрываючы сапраўдныя мэты вайны, яе імперыялістычны, захватніцкі характар. Кожны імперыялістычны ўрад заяўляў, што вайна вядзецца для абароны сваёй радзімы.

Абманваць народ дапамагалі буржуазіі апартуністы з II Інтэрнацыянала. Соцыял-дэмакраты II Інтэрнацыянала подла здрадзілі справе соцыялізма, справе міжнароднай салідарнасці пролетарыята. Яны не толькі не выступілі супроць вайны, але наадварот дапамагалі буржуазіі натраўліваць рабочых і сялян ваюючых дзяржаў адных на другіх пад спягам абароны бацькаўшчыны.

Расія не выпадкова выступіла ў імперыялістычнай вайне на баку Антанты — Францыі і Англіі. Неабходна мець на ўвазе, што перад 1914 годам важнейшыя галіны прамысловасці Расіі знаходзіліся ў руках замежнага капітала, галоўным чынам французскага, англійскага і бельгійскага, гэта значыць краін Антанты. Важнейшыя металургічныя заводы Расіі знаходзіліся ў руках французскіх капіталістаў. У цэлым металургія амаль на тры чэрці (на 72 процанты) залежала ад замежнага капітала. У каменавугольнай прамысловасці — у Данбасе — была такая-ж карціна. Каля палавіны нафтавай здабычы знаходзілася ў руках англа-французскага капітала. Значная частка прыбыткаў рускай прамысловасці ішла ў заграніччыя, пераважна — у англа-французскія банкі. Усе гэтыя акалічнасці плюс мільярдныя пазыкі, заключаныя царом у Францыі і Англіі, прыкавалі царызм да англа-французскага імперыялізма.

2. ПЕРАХОД ПАРТЫЙ II ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА НА БОК СВАІХ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНЫХ УРАДАЎ. РАСПАДЗЕННЕ II ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА НА АСОБНЫЯ СОЦЫЯЛ-ШАВІНІСТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ.

Ленін не раз папярэджваў аб апартунізме II Інтэрнацыянала і няўстойлівасці яго правадыроў. Ён ўвесь час цвярдзіў, што правадыры II Інтэрнацыянала толькі на словах стаяць супроць вайны, што ў выпадку, калі вайна надыйдзе, яны могуць змяніць сваю пазіцыю і перабегчы на бок імперыялістычнай буржуазіі, могуць стаць староннікамі вайны. Першыя-ж дні вайны пацвердзілі прадбачанне Леніна.

У 1910 годзе на кангрэсе II Інтэрнацыянала ў Капенгагене было прынята рашэнне аб тым, што соцыялісты павінны ў парламентах галасаваць супроць ваенных крэдытаў. У часе вайны на Балканах у 1912 годзе Міжнародны кангрэс II Інтэрнацыянала ў Базеле заявіў, што рабочыя ўсіх краін лічаць злачынствам страляць адны ў другіх дзеля павелічэння прыбыткаў капіталістаў. Так было на словах, у рэзалюцыях.

Калі-ж грымнуў гром імперыялістычнай вайны і трэба было гэтыя рашэнні правесці ў жыццё, правадыры II Інтэрнацыянала аказаліся прадаўцамі здраднікамі пролетарыята, аказаліся слугамі буржуазіі, — сталі староннікамі вайны.

4 жніўня 1914 года германская соцыял-дэмакратыя галасавала ў парламенце за ваенныя крэдыты, за падтрыманне імперыялістычнай вайны. Тое-ж самае зрабіла пераважная большасць соцыялістаў Францыі, Англіі, Бельгіі і іншых краін.

II Інтэрнацыянал перастаў існаваць. Ён распаўся на справе на асобныя соцыял-шавіністычныя партыі, ваюючыя адна з другой.

Правадыры соцыялістычных партый здрадзіўшы пролетарыяту, перайшлі на пазіцыю соцыял-шавінізма і абароны імперыялістычнай буржуазіі. Яны дапамагалі імперыялістычным урадам аблураць рабочы клас і атручваць яго ядам нацыяналізма. Гэтыя соцыял-здраднікі пад флагам абароны бацькаўшчыны пачалі натраўліваць нямецкіх рабочых на французскіх а англійскіх і французскіх рабочых — на нямецкіх. Толькі нязначная меншасць у II Інтэрнацыянале асталася на інтэрнацыяналістычнай пазіцыі і пайшла супроць цячэння праўда, не зусім ўпэўнена і не зусім цвёрда, але ўсё-ж пайшла супроць цячэння.

Толькі партыя большэвікоў адразу-ж і без хістанняў узняла сцяг рашучай барацьбы супроць імперыялістычнай вайны. У тэзісах аб вайне, напісаных Леніным восенню 1914 г., Ленін указваў, што падзенне II Інтэрнацыянала не з'яўляецца выпадковасцю. II Інтэрнацыянал загубілі апартуністы, супроць якіх ужо даўно папярэджвалі лепшыя прадстаўнікі рэволюцыйнага пролетарыята.

Партыі II Інтэрнацыянала і да вайны былі заражаны апартунізмам. Апартуністы адкрыта прапаведвалі адмову ад рэволюцыйнай барацьбы, прапаведвалі гэорыю «мірнага ўрастання» капіталізма ў соцыялізм». II Інтэрнацыянал не хацеў змагацца з апартунізмам стаяў за мір з ім і даў яму ўмацавацца. Прытрымліваючыся прымірэнчай палітыкі ў адносінах апартунізма, II Інтэрнацыянал сам стаў апартуністычным.

Імперыялістычная буржуазія за кошт сваіх прыбыткаў ад калоній, ад эксплаатацыі адсталых краін сістэматычна падкупала шляхам больш высокай заработнай платы і іншых падачак вярхушку кваліфікаваных рабочых, так званую рабочую арыстакратыю. З гэтай праслойкі рабочых вышла нямала кіраўнікоў профсаюзаў і кааператываў, муніцыпальных і парламенцкіх дэпутатаў, работнікаў друку і соцыял-дэмакратычных арганізацый. У момант вайны гэтыя людзі, баючыся страціць сваё становішча, сталі праціўнікамі рэволюцыі, сталі самымі ярымі абаронцамі сваёй буржуазіі, сваіх імперыялістычных урадаў.

Апартуністы сталі соцыял-шавіністамі.

Соцыял-шавіністы, у тым ліку рускія меншавікі і эсэры, прапаведвалі **класавы мір** рабочых з буржуазіяй унутры краны і вайну з іншымі народамі па-за сваёй краінай. Яны абманвалі масы наконт сапраўдных віноўнікаў вайны, заяўляючы, што буржуазія іх краіны не вінавата ў вайне. Многія соцыял-шавіністы сталі міністрамі імперыялістычных урадаў сваёй краіны.

Не менш небяспечнымі для справы пролетарыята былі скрытыя соцыял-шавіністы, так званыя цэнтрысты. Цэнтрысты — Каўцкі, Троцкі, Мартаў і іншыя апраўдвалі і абаранялі адкрытых соцыял-шавіністаў, стала быць здраджвалі пролетарыяту разам з соцыял-шавіністамі, прыкрываючы сваю здраду «левымі» фразамі аб барацьбе з вайной, разлічанымі на абман рабочага класа. На справе цэнтрысты падтрымлівалі вайну бо прапанова цэнтрыстаў — не галасаваць супроць крэдытаў на вайну і абмежавацца ўстрыманнем пры галасаванні крэдытаў на вайну, — азначала падтрыманне вайны. Яны таксама, як і соцыял-шавіністы, патрабавалі адмовы ад класавай барацьбы ў часе вайны, каб не перашкаджаць свайму імперыялістычнаму ўраду весці вайну. Цэнтрыст Троцкі па ўсіх важнейшых пытаннях вайны і соцыялізма стаяў супроць Леніна, супроць большэвіцкай партыі.

Ленін стаў з першых-жа дзён вайны збіраць сілы для стварэння новага III Інтэрнацыянала. Ужо ў маніфесце супроць вайны ў лістападзе 1914 года ЦК большэвіцкай партыі паставіў задачу стварыць III Інтэрнацыянал замест пацярпеўшага ганебны крах II Інтэрнацыянала.

У лютым 1915 года ў Лондане на канферэнцыі соцыялістаў краін Антанты па даручэнню Леніна выступіў т. Літвінаў. Літвінаў патрэбаваў выхаду соцыялістаў (Вандэрвельдэ, Самбат, Гед) з буржуазных урадаў Бельгіі і Францыі і поўнага разрыву з імперыялістамі, адмовы ад супрацоўніцтва з імі. Ён патрабаваў ад усіх соцыялістаў рашучай барацьбы супроць сваіх імперыялістычных урадаў і асуджэння галасавання за ваенныя крэдыты. Але голас Літвінава на гэтай канферэнцыі прагучэў адзінока.

У пачатку верасня 1915 года ў Цымервальдзе сабралася першая канферэнцыя інтэрнацыяналістаў. Ленін называў гэтую канферэнцыю «першым крокам» у развіцці інтэрнацыянальнага руху супроць вайны. Ленін утварыў на гэтай канферэнцыі Цымервальдскую левую групу. Але ў гэтай Цымервальдскай левай адзіна правільную, да канца паслядоўную пазіцыю супроць вайны займала толькі партыя большэвікоў на чале з Леніным. Цымервальдская левая выдавала на нямецкай мове журнал «Прадвеснік», у якім друкаваліся артыкулы Леніна.

У 1916 годзе ўдалося склікаць у швейцарскай вёсцы Кінталі другую канферэнцыю інтэрнацыяналістаў. Яна называецца другой Цымервальдскай канферэнцыяй. К гэтаму часу амаль ва ўсіх краінах выдзеліліся групы інтэрнацыяналістаў, больш рэзка наміціўся раскол інтэрнацыяналістычных элементаў з соцыял-шавіністамі. А галоўнае — самі масы к гэтаму часу палявелі пад уплывам вайны і выкліканых ёю бядот. Кінтальскі маніфест быў выпрацаван ў рэзультаце пагаднення розных груп, якія змагаліся на канферэнцыі. Ён быў крокам наперад у параўнанні з Цымервальдскім маніфестам.

Але і Кінтальская канферэнцыя не прыняла асноўных палажэнняў палітыкі большэвікоў: ператварэнне імперыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую, паражэнне ў вайне сваіх імперыялістычных урадаў, арганізацыя III Інтэрнацыянала. Тым не менш Кінтальская канферэнцыя садзейнічала выдзяленню інтэрнацыяналістычных элементаў з якіх у далейшым утварыўся Комуністычны III Інтэрнацыянал.

Ленін крытыкаваў памылкі непаслядоўных інтэрнацыяналістаў з левых соцыял-дэмакратаў, такіх, як Роза Люксембург, Карл Лібкнехт, але ў той-жа час дапамагаў ім заняць правільную пазіцыю.

3. ТЭОРЫЯ І ТАКТЫКА БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ ПА ПЫТАННЯХ ВАЙНЫ, МІРУ І РЭВОЛЮЦЫІ.

Большэвікі не былі простымі пацыфістамі (староннікамі міру), якія ўздыхалі аб міры і абмяжоўваліся прапагандай міру як гэта рабіла большасць левых соцыял-дэмакратаў. Большэвікі сталі за актыўную рэволюцыйную барацьбу за мір аж да звяржэння ўлады ваяўнічай імперыялістычнай буржуазіі. Большэвікі звязвалі справу міру са справай перамогі пролетарскай рэволюцыі лічачы, што найбольш верным сродкам для ліквідацыі вайны і заваявання справядлівага міру, міру без анексій і кантрыбуцый, — з'яўляецца звяржэнне улады імперыялістычнай буржуазіі.

Супроць меншавіцка-эсэраўскага адрачэння ад рэволюцыі і прэлапельская лозунга аб захаванні «грамадзянскага міру» ў часе вайны — большэвікі выставілі лозунг **«ператварэння вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую»**. Лозунг гэты азначаў, што працоўныя, у тым ліку ўзброеныя рабочыя і сяляне, пераадзетыя ў салдацкія шынелі, павінны павярнуць зброю супроць сваёй буржуазіі і звергнуць яе ўладу, калі яны хочуць вызваліцца ад вайны і дабіцца справядлівага міру.

Супроць меншавіцка-эсэраўскай палітыкі абароны буржуазнай бацькаўшчыны — большэвікі высунулі палітыку **«паражэння свайго ўрада ў імперыялістычнай вайне»**. Гэта азначала, што неабходна галасаваць супроць ваенных крэдытаў, ствараць нелегальныя рэволюцыйныя арганізацыі ў арміі, падтрымліваць братанне салдат на фронце і арганізаваць рэволюцыйныя выступленні рабочых і сялян супроць вайны, пераводзячы іх у паўстанне супроць свайго імперыялістычнага ўрада.

Большэвікі лічылі, што найменшым злом для народа ў імперыялістычнай вайне было-б ваеннае паражэнне царскага ўрада, бо яно аблягчала-б перамогу народа над царызмам і паспяховую барацьбу рабочага класа за вызваленне ад капіталістычнага рабства і імперыялістычных войн. Пры гэтым Ленін лічыў, што палітыку паражэння свайго імперыялістычнага ўрада павінны праводзіць не толькі рускія рэволюцыянеры, але і рэволюцыйныя партыі рабочага класа **ўсіх** ваюючых краін.

Большэвікі не былі супроць **усякай** вайны. Яны былі толькі супроць захватніцкай супроць імперыялістычнай вайны. Большэвікі лічылі, што вайна бывае двух радоў:

а) вайна **справядлівая**, незахватніцкая, вызваленчая, якая мае на мэце або абарону народа ад знешняга нападу і спроб яго заняволення або вызваленне народа ад рабства капіталізма, або нарэшце вызваленне калоній і залежных краін ад гнёту імперыялістаў;

б) вайна **несправядлівая**, захватніцкая, якая мае на мэце захват і заняволенне чужых краін, чужых народаў.

Вайну першага роду большэвікі падтрымлівалі. Што датычыць вайны другога роду, большэвікі лічылі, што супроць яе трэба весці рашучую барацьбу аж да рэволюцыі звяржэння свайго імперыялістычнага ўрада.

Велізарнае значэнне для рабочага класа ўсяго свету мела тэарэтычная работы Леніна ў часе вайны. Вясной 1916 года Ленін напісаў работу «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізма». Ленін паказаў у гэтай кнізе, што імперыялізм — гэта вышэйшая стадыя капіталізма, калі ён паспеў ужо з «прагрэсіўнага» капіталізма ператварыцца ў капіталізм паразітычны, у капіталізм загніваючы, што імперыялізм — ёсць паміраючы капіталізм. Гэта, вядома, не азначала, што капіталізм сам адамрэ без рэволюцыі пролетарыята, што ён сам згніе на кораню. Ленін заўсёды вучыў, што без рэволюцыі рабочага класа немагчыма звергнуць капіталізм. Таму, вызначыўшы імперыялізм, як паміраючы капіталізм, Ленін разам з тым паказаў у гэтай кнізе, што «імперыялізм ёсць пярэдадзень соцыяльнай рэволюцыі пролетарыята».

Ленін паказаў, што капіталістычны гнёт у эпоху імперыялізма ўсё больш узмацняецца, што ва ўмовах імперыялізма расце абурэнне пролетарыята супроць асноў капіталізма, нарастаюць элементы рэволюцыйнага выбуху ўнутры капіталістычных краін.

Ленін паказаў, што ў эпоху імперыялізма абвастраецца рэволюцыйны крызіс у каланіяльных і залежных краінах, нарастаюць элементы абурэння супроць імперыялізма, нарастаюць элементы вызваленчай вайны супроць імперыялізма.

Ленін паказаў, што ва ўмовах імперыялізма няроўнамернасць развіцця і супярэчнасці капіталізма асабліва абвастрыліся, што барацьба за рынкі збыту тавараў і вывазу капітала, барацьба за калоніі, за крыніцы сыравіны робіць немінучымі перыядычныя імперыялістычныя войны за новы перадзел свету.

Ленін паказаў, што іменна ў выніку гэтай няроўнамернасці развіцця капіталізма адбываюцца імперыялістычныя войны, якія аслабляюць сілы імперыялізма і робяць магчымым прарыў фронта імперыялізма там, дзе ён аказацца ўсяго слабей.

На падставе ўсяго гэтага Ленін прышоў да вываду, што зусім магчым прарыў імперыялістычнага фронта пролетарыятам дзе-небудзь у адным месцы або некалькіх месцах, што **магчыма** перамога соцыялізма першапачаткова ў некалькіх краінах або нават у адной, асобна ўзятай краіне, што адначасовая перамога соцыялізма ва ўсіх краінах з прычыны няроўнамернасці развіцця капіталізма ў гэтых краінах, — **немагчыма**, што соцыялізм пераможа першапачаткова ў адной або некалькіх краінах, а астатнія краіны на працягу некаторага часу астануцца буржуазнымі краінамі.

Вось фармуліроўка гэтага геніяльнага вываду, даная Леніным у двух розных артыкулах, напісаных у перыяд імперыялістычнай вайны:

1) «Няроўнамернасць эканамічнага і палітычнага развіцця ёсць безумоўны закон капіталізма. Адсюль вынікае, што магчыма перамога соцыялізма першапачаткова ў нямногіх або нават у адной асобна ўзятай капіталістычнай краіне. Перамогшы пролетарыят гэтай краіны, экспрапрыяваўшы капіталістаў і арганізаваўшы ў сябе соцыялістычную вытворчасць, паўстаў-бы **супроць** астатняга капіталістычнага свету, прыцягваючы да сябе прыгнечаныя класы іншых краін...» (З артыкула «Аб лозунгу Злучаных Штатаў Еўропы», пісанага ў жніўні 1915 года). (**Ленін**, т. XVIII, стар. 232—233).

2) «Развіццё капіталізма адбываецца ў вышэйшай ступені няроўнамерна ў розных краінах. Інакш і не можа быць пры таварнай вытворчасці. Адсюль бясспрэчны вывад: соцыялізм не можа перамагчы адначасова **ва ўсіх** краінах. Ён пераможа першапачаткова ў адной або некалькіх краінах, а астатнія на працягу некаторага часу астануцца буржуазнымі або дабуржуазнымі. Гэта павінна выклікаць не толькі трэнні, але і прамое імкненне буржуазіі іншых краін да разгрому пераможнага пролетарыята соцыялістычнай дзяржавы. У гэтых выпадках вайна з нашага боку была-б законнай і справядлівай. Гэта была-б вайна за соцыялізм, за вызваленне іншых народаў ад буржуазіі». (З артыкула «Ваенная праграма пролетарскай рэволюцыі» пісанага восенню 1916 года) (**Ленін**, т. XIX, стар. 325).

Гэта была **новая**, закончаная тэорыя соцыялістычнай рэволюцыі, тэорыя аб магчымасці перамогі соцыялізма ў асобных краінах аб умовах яго перамогі, аб перспектывах яго перамогі, тэорыя, асновы якой былі намечаны Леніным яшчэ ў 1905 годзе ў брашуры «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі».

Яна ў корані разыходзілася з той устаноўкай, якая мела хаджэнне сярод марксістаў у перыяд **даімперыялістычнага** капіталізма, калі марксісты лічылі, што перамога соцыялізма ў адной якой-небудзь краіне немагчыма, што перамога соцыялізма адбудзецца адначасова ва ўсіх цывілізаваных краінах. Ленін на падставе даных аб **імперыялістычным** капіталізме, выкладзеных у яго выдатнай кнізе «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізма», перавярнуў гэту ўстаноўку, як устарэлую, і даў новую тэарэтычную ўстаноўку у сілу якой адначасовая перамога соцыялізма ва ўсіх краінах лічыцца **немагчымай**, а перамога соцыялізма ў адной, асобна ўзятай, капіталістычнай краіне прызнаецца **магчымай**.

Неацэнімае значэнне ленінскай тэорыі соцыялістычнай рэволюцыі заключаецца не толькі ў тым, што яна ўзбагаціла марксізм новай тэорыяй і рушыла яго наперад. Яе значэнне заключаецца яшчэ ў тым, што яна дае рэволюцыйную перспектыву пролетарыям асобных краін, развязвае іх ініцыятыву ў справе націску на сваю нацыянальную буржуазію, вучыць іх скарыстоўваць абстаноўку вайны для арганізацыі такога націску і ўмацоўвае іх веру ў перамогу пролетарскай рэволюцыі.

Такая вось была тэарэтычная і тактычная ўстаноўка большэвікоў па пытаннях вайны, міру і рэволюцыі.

На аснове гэтай устаноўкі праводзілі сваю практычную работу ў Расіі большэвікі.

Не гледзячы на жорсткія паліцэйскія праследаванні, думскія дэпутаты — большэвікі Бадаеў, Петроўскі, Мураноў, Самойлаў, Шагаў у пачатку вайны прадпрынялі абезд раду арганізацый з дакладамі аб адносінах большэвікоў да вайны і рэволюцыі. У лістападзе 1914 года была склікана нарада большэвіцкай фракцыі Дзяржаўнай думы для абмеркавання пытання аб адносінах да вайны. На трэці дзень пасяджэнне гэтае ў поўным саставе было арыштавана. Суд прыгаварыў усіх дэпутатаў да пазбаўлення правоў і ссылкі на пасяленне ва Усходнюю Сібір. Царскі ўрад абвінавачваў большэвіцкіх дэпутатаў Дзяржаўнай думы ў «дзяржаўнай здрадзе».

На судзе выяснілася карціна дзейнасці думскіх дэпутатаў, якая рабіла чэсць нашай партыі. Мужна вялі сябе большэвікі-дэпутаты перад царскім судом ператварыўшы яго ў трыбуну для выкрыцця захватніцкай палітыкі царызма.

Інакш вёў сябе прыцягнуты па гэтай справе Каменеў. З прычыны сваёй трусасці ён пры першай-жа небяспецы адрокся ад палітыкі большэвіцкай партыі. Каменеў на судзе заявіў, што ён не згодзен з большэвікамі па пытанню аб вайне і ў доказ гэтага прасіў выклікаць сведкай меншавіка Іорданскага.

Вялікую работу правялі большэвікі супроць ваенна-прамысловых камітэтаў, якія абслугоўвалі вайну, супроць спроб меншавікоў падпарадкаваць рабочых уплыву імперыялістычнай буржуазіі. Буржуазія была кроўна зацікаўлена ў тым, каб прадставіць перад усімі імперыялістычную вайну, як вайну ўсенародную. Буржуазія дабілася ў часе вайны вялікага ўплыву на дзяржаўныя справы, стварыўшы сваю ўсерасійскую арганізацыю — саюзы земстваў і гаралоў. Ей трэба было падпарадкаваць свайму кіраўніцтву і ўплыву таксама і рабочых. Буржуазія прыдумала для гэтага сродак — стварэнне «рабочых груп» пры ваенна-прамысловых камітэтах. Меншавікі падхапілі гэту ідэю буржуазіі. Буржуазіі выгадна было прыцягнуць у гэтыя ваенна-прамысловыя камітэты прадстаўнікоў рабочых, якія агітавалі-б сярод рабочых мас за неабходнасць узмацніць прадукцыйнасць працы па снарадных гарматных збройных, патронных і іншых фабрыках і заводах, якія працавалі на абарону: «Усё для вайны, усе на вайну», — такі быў лозунг буржуазіі. На справе гэты лозунг абазначаў: «нажывайся ва-ўсю на ваенных пастаўках і на захваце чужых зямель». Меншавікі прынялі дзейны ўдзел у гэтай лжэпатрыятычнай справе, запеянай буржуазіяй. Дапамагаючы капіталістам, яны ўзмоцнена агітавалі рабочых прымаць удзел у выбарах «рабочых груп» пры ваенна-прамысловых камітэтах. Большэвікі былі супроць гэтай зацеі. Яны былі за байкот ваенна-прамысловых камітэтаў і правялі паспяхова гэты байкот. Але частка рабочых усё-такі прыняла ўдзел у дзейнасці ваенна-

(ПРАЦЯГ НА 3 СТАР.)

ПРАЦЯГ.

прамысловых камітэтаў пад кіраўніцтвам вядомага меншавіка Гвоздзёва і правакатара Абрасімава. Калі-ж упаўнаважаныя ад рабочых сабраліся ў верасні 1915 года для канчатковых выбараў у «рабочыя групы» ваенна-прамысловых камітэтаў, то аказалася, што большасць упаўнаважаных супроць удзелу ў іх. Большасць прадстаўнікоў рабочых вынесла рэзкую рэзалюцыю супроць удзелу ў ваенна-прамысловых камітэтах, заявіўшы, што рабочыя ставяць перад сабой задачу — змагацца за мір, за звяржэнне царызма.

Вялікую работу разгарнулі большэвікі таксама ў арміі і флоце. Яны растлумачвалі масам салдат і матросаў, хто вінават у нечуваных жахах вайны і пакутах народа, растлумачвалі, што рэволюцыя — адзіны выхад для народа з імперыялістычнай бойні. Большэвікі стваралі ячэйкі ў арміі і флоце, на фронце і ў тылавых часцях, распаўсюджвалі лістоўкі з заклікам супроць вайны.

У Кранштаце большэвікамі быў створан «Галоўны калектыў кранштацкай ваеннай арганізацыі», які знаходзіўся ў цеснай сувязі з Петраградскім камітэтам партыі. Была створана ваенная арганізацыя пры Петраградскім камітэце партыі для работы ў гарнізоне. У жніўні 1916 года начальнік петраградскай ахранкі даносіў, што ў «Кранштацкім калектыве справа пастаўлена вельмі сур'ёзна, канспіратыўна, і ўдзельнікі — усе маўклівыя і асцярожныя людзі. Калектыў гэты мае прадстаўнікоў і на беразе».

Партыя на фронце вяла агітацыю за братанне паміж салдатамі ваюючых армій, падкрэсліваючы, што вораг — гэта сусветная буржуазія і што вайну скончыць можна толькі ператварыўшы вайну імперыялістычную ў вайну грамадзянскую і накіраваўшы зброю супроць сваёй уласнай буржуазіі і яе ўрада. Усё часцей паўтараліся выпадкі адмовы асобных вайсковых часцей ісці ў наступленне. Такія факты мелі месца ўжо ў 1915 годзе і асабліва ў 1916 годзе.

Асабліва вялікая работа была разгорнута большэвікамі ў арміях паўночнага фронта ў раёне Прыбалтыкі. Галоўнакамандуючы арміяй паўночнага фронта генерал Рузскі паведамляў па начальству ў пачатку 1917 года аб велізарнай рэволюцыйнай рабоце, разгорнутай большэвікамі на гэтым фронце.

Вайна была найвялікшым пераломам у жыцці народаў, у жыцці міжнароднага рабочага класа. Яна паставіла на карту лёс дзяржаў, лёс народаў, лёс социялістычнага руху. Таму яна была разам з тым пробным каменем, выпрабаваннем для ўсіх партый і плыней, якія называлі сябе социялістычнымі. Ці астануцца гэтыя партыі і плыні вернымі справе социялізма, справе інтэрнацыяналізма, або палічаць за лепшае здрадзіць рабочаму класу, згарнуць свае сцягі і кінуць іх к стапам сваёй нацыянальнай буржуазіі, — так стаяла тады пытанне.

Вайна паказала, што партыі II Інтэрнацыянала не вытрымалі іспытання, здрадзілі рабочаму класу і схілілі свае сцягі перад сваёй нацыянальнай, імперыялістычнай буржуазіяй.

Інакш і не маглі паступіць гэтыя партыі, якія культывавалі ў сваім асяродзі апартунізм і былі выхаваны на ўступках апартуністам, нацыяналістам.

Вайна паказала, што партыя большэвікоў была адзінай партыяй, якая вытрымала з чэсцю іспытанне і асталася вернай да канца справе социялізма, справе пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Яно і зразумела: толькі партыя новага тыпу, толькі партыя, выхаваная ў духу непрымірымай барацьбы з апартунізмам, толькі партыя свабодная ад апартунізма і нацыяналізма — толькі такая партыя магла вытрымаць вялікае іспытанне і астацца вернай справе рабочага класа, справе социялізма і інтэрнацыяналізма.

Большэвіцкая партыя была такой іменна партыяй.

4. ПАРАЖЭННЕ ЦАРСКІХ ВОЙСК НА ФРОНЦЕ. ГАСПАДАРЧАЯ РАЗРУХА. КРЫЗІС ЦАРЫЗМА.

Вайна ішла ўжо тры годы. Вайна забірала жыццё ў мільёнаў людзей, забітых, раненых, памёршых у рэзультаце эпідэмій, пароджаных вайной. Буржуазія і памешчыкі нажываліся на вайне. Але рабочыя і сяляне пераносілі ўсё больш нужды і лішэнняў. Вайна разбурала народную гаспадарку Расіі. Каля 14 мільёнаў здаровых работнікаў было ўзята ў армію, адарвана ад гаспадаркі. Фабрыкі і заводы спыняліся. Скарацілася пасевы зярна — нехапала работнікаў. Насельніцтва і салдаты на фронце галадалі, былі разуты і раздзеты. Вайна пажырала ўсе рэсурсы краіны.

Царская армія цярпела паражэнне за паражэннем. Нямецкая артылерыя засыпала царскія войскі градам снарадаў. У царскай арміі нехапала гармат, нехапала снарадаў, нехапала нават вінтовак. Часамі на трох салдат прыходзілася адна вінтоўка. Ужо ў часе вайны раскрылася здрада царскага ваеннага міністра Сухамлінава, які аказаўся звязаным з нямецкімі шпіёнамі. Сухамлінаў выконваў заданне нямецкай разведкі — сарваць снабжэнне фронта снарадамі, не даваць фронту гармат, не даваць вінтовак. Некаторыя царскія міністры і генералы самі тайком садзейнічалі поспехам нямецкай арміі: разам з царыцай, звязанай з немцамі, яны выдавалі немцам ваенныя тайны. Не дзіўна, што царская армія цярпела паражэнне і вымушана была адступаць. К 1916 году немцы паспелі ўжо захваціць Польшчу і частку Прыбалтыкі.

Усё гэта выклікала нянавісць і азлабленне да царскага ўрада сярод рабочых, сялян, салдат інтэлігенцыі, узмацняла і абвастрала рэволюцыйны рух народных мас супроць вайны, супроць царызма як у тылу, так і на фронце, як у цэнтры, так і на акраінах.

Незадаволенне пачало захватваць таксама рускую імперыялістычную буржуазію. Яе азлабляла тая акалічнасць, што пры царскім дворэ гаспадарылі прайдохі, накшталт Распуціна, якія ўна вялі лінію на заключэнне сепаратнага міру з немцамі. Яна ўсё больш пераконвалася, што царскі ўрад вяздолен весці паспяховую вайну. Яна баялася, што царызм, каб выратаваць сваё становішча, можа пайсці на сепаратны мір з немцамі. Таму руская буржуазія рашыла правесці дварцовы пераварот, з тым каб скінуць цара Нікалая II і замест яго паставіць царом звязанага з буржуазіяй Міхаіла Раманава. Гэтым яна хацела забіць двух зайцаў: па-першае прабрацца да ўлады і забяспечыць далейшае вядзенне імперыялістычнай вайны, па-другое — папярэдзіць невядомы дварцовым пераваротам наступленне вялікай народнай рэволюцыі, хвалі якой нарасталі.

Рускую буржуазію цалкам падтрымлівалі ў гэтай справе англійскі і французскі ўрады. Яны бачылі, што цар няздолен прадаўжаць вайну. Яны баяліся, што цар скончыць справу сепаратным мірам з немцамі. Калі-б царскі ўрад заключыў сепаратны мір, урады Англіі і Францыі страцілі-б у асобе Расіі саюзніка ў вайне, які не толькі адцягваў на свае франты сілы працаўніка, але і пастаўляў у Францыю дзесяткі тысяч адборных рускіх салдат. Таму яны аказалі падтрыманне рускай буржуазіі ў яе спробах зрабіць дварцовы пераварот.

Цар аказаўся такім чынам, ізаляваным.

У той час як няўдачы на фронце не спыняліся, гаспадарчая разруха прадаўжала ўсё больш і больш нарастаць. У студзеньска-лютаўскія дні 1917 года харчовая сыравінная і паліўная разруха дасягнула найвышэйшага свайго развіцця і найбольшай вастрыні. Амаль спыніўся падвоз прадуктаў у Петраград і ў Маскву. Пачалі закрывацца адно прадпрыемства за другім. Закрыццё прадпрыемстваў узмацніла беспрацоўе. Асабліва невыносна стала становішча рабочых. Усё больш шырокія масы народа пераконваліся, што выхад з невыноснага становішча толькі адзін — звяржэнне царскага самадзяржаўя.

Царызм яўна перажываў смяртэльны крызіс.

Буржуазія думала вырашыць крызіс шляхам дварцовага перавароту.

Але народ вырашыў яго па-свойму.

5. ЛЮТАЎСКАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ. ПАДЗЕННЕ ЦАРЫЗМА. УТВАРЭННЕ СОВЕТАЎ РАБОЧЫХ І САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ. УТВАРЭННЕ ЧАСОВАГА ЎРАДА. ДВОЕЎЛАДДЗЕ.

1917 год пачаўся стачкай 9 студзеня. У часе стачкі адбыліся дэманстрацыі ў Петраградзе, у Маскве, у Баку, Ніжнім Ноўгарадзе, прычым у Маскве 9 студзеня прымала ўдзел у забастоўцы каля адной трэці ўсіх рабочых. Двухтысячная дэманстрацыя на Тверскім бульвары была разагнана коннай паліцыяй. У Петраградзе на Выбаргскім шасе да дэманстрантаў далучыліся салдаты.

«Ідэя ўсеагульнай стачкі, — даносіла петраградская паліцыя, — з дня на дзень набывае новых староннікаў і становіцца папулярнай якой яна была ў 1905 годзе».

Меншавікі і эсэры стараліся ўвесці пачаўшыйся рэволюцыйны рух у патрэбныя ліберальнай буржуазіі рамкі. Да дня адкрыцця Дзяржаўнай думы, 14 лютага меншавікі прапанавалі арганізаваць шэсце рабочых да Дзяржаўнай думы. Але рабочыя масы пайшлі за большэвікамі, не да думы, а на дэманстрацыю.

18 лютага 1917 года пачалася забастоўка пупілаўскіх рабочых у Петраградзе. 22 лютага баставалі рабочыя большасці буйнейшых прадпрыемстваў. У Міжнародны дзень работніцы 23 лютага (8 сакавіка), па закліку Петраградскага камітэта большэвікоў работніцы вышлі на вуліцу дэманстраваць супроць голаду вайны, царызма. Дэманстрацыю работніц падтрымалі рабочыя агульным забастовачным выступленнем па Петраграду. Палітычная стачка пачала перарастаць у агульную палітычную дэманстрацыю супроць царскага ладу.

24 лютага (9 сакавіка) дэманстрацыя ўзнаўляецца з большай сілай. Баставала ўжо каля 200 тысяч рабочых.

25 лютага (10 сакавіка) рэволюцыйны рух ахапляе ўвесь рабочы Петраград. Палітычныя забастоўкі па раёнах пераходзяць ва ўсеагульную палітычную забастоўку па ўсяму Петраграду. Усюды дэманстрацыі і сутычкі з паліцыяй. Над масамі рабочых — чырвоныя сцягі з лозунгамі: «Далоў цара!», «Далоў вайну!», «Хлеба!».

Раніцай 26 лютага (11 сакавіка) палітычная стачка і дэманстрацыя пачынаюць перарастаць у спробы паўстання. Рабочыя раззбройваюць паліцыю і жандармерыю і ўзбройваюцца самі. Аднак узброеная сутычка з паліцыяй заканчваецца расстрэлам дэманстрацыі на Знаменскай плошчы.

Генерал Хабалаў які камандаваў Петраградскай ваеннай акругай аб'яўляе, што рабочыя павінны прыступіць да работы 28 лютага (13 сакавіка), што інакш яны будуць адпраўлены на фронт. 25 лютага (10 сакавіка) цар дае загад генералу Хабалаву: «Павеляваю заўтра-ж спыніць у сталіцы беспарадкі».

Але «спыніць» рэволюцыю ўжо нельга было.

Днём 26 лютага (11 сакавіка) 4-я рота запаснога батальёна Паўлаўскага палка адкрыла агонь, але не па рабочых, а па атрадах конных гарадавых, уступіўшых у перастрэлку з рабочымі. Барацьба за войска разгарнулася самая энергічная і настойлівая. У асабістасці з боку жанчын-работніц, якія звярталіся непасрэдна да салдат, браталіся з імі, заклікалі іх дапамагчы народу звергнуць ненавіснае ім царскае самадзяржаўе.

Кіраўніцтва практычнай работай большэвіцкай партыі ажыццяўлялася ў гэты час знаходзіўшымся ў Петраградзе Бюро Цэнтральнага Камітэта нашай партыі на чале з тав. Молатавым. Бюро ЦК выпусціла 26 лютага (11 сакавіка) маніфест з заклікам да прадаўжэння ўзброенай барацьбы супроць царызма, да стварэння Часовага рэволюцыйнага ўрада.

27 лютага (12 сакавіка) войскі ў Петраградзе адмовіліся страляць у рабочых і пачалі пераходзіць на бок паўстаўшага народа. Яшчэ раніцай 27 лютага было толькі 10 тысяч паўстаўшых салдат, а вечарам іх было ўжо звыш 60 тысяч.

Паўстаўшыя рабочыя і салдаты сталі арыштоўваць царскіх міністраў і генералаў, вызваляць з турмаў рэволюцыянераў. Вызваленыя палітычныя зняволеныя ўключаліся ў справу рэволюцыйнай барацьбы.

На вуліцах яшчэ ішла перастрэлка з гарадавымі і жандарамі, якія заселі на чардаках дамоў з кулямётамі. Але быстры пераход войск на бок рабочых рашыў лёс царскага самадзяржаўя.

Калі вестка аб перамозе рэволюцыі ў Петраградзе пашырылася ў іншых гарадах і на фронце, рабочыя і салдаты ўсюды пачалі звяргаць царскіх чыноўнікаў.

Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэволюцыя перамагла.

Рэволюцыя перамагла таму, што рабочы клас быў застрэльшчыкам рэволюцыі і ўзначальваў рух мільённых мас сялян, пераадзетых у салдацкія шынелі — «за мір, за хлеб, за свабоду». Гегемонія пролетарыята абумовіла поспех рэволюцыі.

«Рэволюцыю зрабіў пролетарыят, ён праявіў гераізм, ён праліваў кроў, ён пацягнуў за сабою самыя шырокія масы працоўнага і бяднейшага насельніцтва», — пісаў Ленін у першыя дні рэволюцыі (**Ленін**, т. XX, стар. 23—24).

Першая рэволюцыя 1905 года падрыхтавала быструю перамогу другой рэволюцыі 1917 года.

«Без трох год найвялікшых класавых бітваў і рэволюцыйнай энергіі рускага пролетарыята 1905—1907 гадоў была-б немагчыма такая быстрая, у сэнсе завяршэння яе **пачатковага** этапа, у некалькі дзён, другая рэволюцыя», — указваў Ленін (**Ленін**, т. XX, стар. 13).

У першыя-ж дні рэволюцыі паявіліся Советы. Перамогшая рэволюцыя апіралася на Советы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Паўстаўшыя рабочыя і салдаты стварылі Советы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Рэволюцыя 1905 года паказала, што Советы з'яўляюцца органамі ўзброенага паўстання і ў той жа самы час зародкам новай рэволюцыйнай улады. Ідэя Советаў жыла ў сазнанні рабочых мас, і яны яе ажыццявілі на другі-ж дзень пасля звяржэння царызма, з той аднак, розніцай што ў 1905 годзе былі створаны Советы толькі **рабочых** дэпутатаў, а ў лютым 1917 года па ініцыятыве большэвікоў паявіліся Советы **рабочых і салдацкіх** дэпутатаў.

У той час, як большэвікі кіравалі непасрэднай барацьбой мас на вуліцах, згодніцкія партыі меншавікі і эсэры захватвалі дэпутацкія месцы ў Советах, утвараючы ў іх сваю большасць. Гэтаму часткова садзейнічала тая акалічнасць, што большасць лідэраў большэвіцкай партыі знаходзілася ў турмах і ссылках (Ленін знаходзіўся ў эміграцыі, Сталін і Свердлоў у Сібірскай ссылцы), тады як меншавікі і эсэры свабодна разгульвалі па вуліцах Петраграда. Такім чынам, на чале Петраградскага Совета і яго Выканаўчага камітэта аказаліся прадстаўнікі згодніцкіх партый: меншавікі і эсэры. Тое-ж самае было ў Маскве і ў радзе іншых гарадоў. Толькі ў Іванава-Вазнесенску, Краснаярску і некаторых іншых гарадах большасць у Советах з самага пачатку належала большэвікам.

Узброены народ — рабочыя і салдаты пасылаючы сваіх прадстаўнікоў у Совет глядзелі на яго, як на орган народнай улады. Яны лічылі і верылі, што Совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў ажыццявіць усе патрабаванні рэволюцыйнага народа і што ў першую чаргу будзе заключан мір.

Але заліпняя даверлівасць рабочых і салдат адыграла з імі злы жарт. Эсэры і меншавікі і не памышлялі аб ліквідацыі вайны аб заваяванні міру. Яны думалі скарыстаць рэволюцыю для таго каб прадоўжыць вайну. Шматычыць рэволюцыі і рэволюцыйных патрабаванняў народа эсэры і меншавікі лічылі што рэволюцыя ўжо закончылася, і цяпер задача заключаецца ў тым, каб замацаваць яе і перайсці на рэльсы «нармальнага», канстытуцыйнага існавання сумесна з буржуазіяй. Таму эсэра-меншавіцкае кіраўніцтва Петраградскага Совета прыняло ўсе залежачыя ад яго меры, каб замяць пытанне аб ліквідацыі вайны, пытанне аб міры і перадаць уладу буржуазіі.

27 лютага (12 сакавіка) 1917 года ліберальныя дэпутаты Дзяржаўнай думы па закуліснаму ўгавору з эсэра-меншавіцкімі лідэрамі ўтварылі Часовы камітэт Дзяржаўнай думы на чале са старшынёй IV думы, памешчыкам і манархістам Радзянка. А праз некалькі дзён пасля гэтага Часовы камітэт Дзяржаўнай думы і эсэра-меншавіцкія лідэры Выканкома Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў тайком ад большэвікоў дагаварыліся аб сфарміраванні новага ўрада Расіі, — буржуазнага Часовага ўрада на чале з князем Львовым, якога яшчэ да лютаўскага пераварота цар Нікалай II намячаў у прэм'ер-міністры свайго ўрада. У саставе Часовага ўрада ўвайшлі глава кадэтаў Мілюкоў, глава акцябрыстаў Гучкоў і іншыя відныя прадстаўнікі класа капіталістаў, а ў якасці прадстаўніка «дэмакратыі» быў уведзен эсэр Керэнскі.

Вышла так, што эсэра-меншавіцкія лідэры Выканкома Совета здалі ўладу буржуазіі, а Совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, паведаўшыся потым аб гэтым, адобрыў сваёй большасцю дзеянні эсэра-меншавіцкіх лідэраў, не гледзячы на пратэсты большэвікоў.

Так утварылася новая дзяржаўная ўлада ў Расіі, якая складалася, як гаварыў Ленін з прадстаўнікоў «буржуазіі і абуржуазіўшыхся памешчыкаў».

Але побач з буржуазным урадам існавала другая ўлада — Совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Салдацкія дэпутаты ў Совеце — гэта былі галоўным чынам, сяляне, мабілізаваныя на вайну. Совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў з'яўляўся органам саюза рабочых і сялян супроць царскай улады і разам з тым — органам іх улады, органам дыктатуры рабочага класа і сялянства.

Такім чынам, атрымалася своеасаблівае перапляценне двух улад, двух дыктатур: дыктатуры буржуазіі, у асобе Часовага ўрада, і дыктатуры пролетарыята і сялянства ў асобе Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Атрымалася **двоеўладдзе**.

Чым вытлумачыць, што ў Советах спачатку аказалася большасць меншавікоў і эсэраў?

Чым вытлумачыць, што перамогшыя рабочыя і сяляне **добраволька** аддалі ўладу прадстаўнікам буржуазіі?

Ленін тлумачыў гэта тым, што прасунуліся і пацягнуліся да палітыкі мільёны людзей, не іскушоных у палітыцы. Гэта былі ў большасці дробныя гаспадары, сяляне, рабочыя з нядаўніх сялян, людзі, якія стаялі пасярэдзіне паміж буржуазіяй і пролетарыятам. Расія была тады найбольш дробнабуржуазнай краінай з усіх вялікіх еўрапейскіх краін. І ў гэтай краіне «гіганцкая дробнабуржуазная хваля захліснула ўсё, падавіла свядомы пролетарыят не толькі сваёй колькаснасцю, але і ідэйна, гэта значыць заразіла, захваціла вельмі шырокія колы рабочых дробнабуржуазнымі поглядамі на палітыку» (**Ленін**, т. XX, стар. 115).

Гэтая хваля дробнабуржуазнай стыхіі і вынесла на паверхню дробнабуржуазныя партыі меншавікоў і эсэраў.

Ленін указваў, што другой прычынай з'яўляецца змена састава пролетарыята у часе вайны і недастатковая свядомасць і арганізаванасць пролетарыята ў пачатку рэволюцыі. У часе вайны адбыліся значныя змены ў саставе самога пролетарыята. Каля 40 процантаў кадравых рабочых было мабілізавана ў армію. На прадпрыемствы ў годы вайны папала, з мэтай укрыцца ад мабілізацыі, многа дробных уласнікаў, саматужнікаў, крамнікаў, чуждых пролетарскай псіхалогіі.

Гэтыя дробнабуржуазныя праслойкі рабочых і з'яўляліся спажыўнай глебай для дробнабуржуазных палітыкаў — меншавікоў і эсэраў.

Вось чаму не іскушоныя ў палітыцы шырокія масы народа, захліснутыя хваляй дробнабуржуазнай стыхіі і ап'янёныя першымі поспехамі рэволюцыі, аказаліся ў першыя месяцы рэволюцыі ў палоне ў згодніцкіх партый і згадзіліся ўступіць буржуазіі дзяржаўную ўладу, наіўна лічачы, што буржуазная ўлада не будзе перашкаджаць Советам весці сваю работу.

Перад большэвіцкай партыяй стаяла задача — цярплівай растлумачальнай работай у масах укрыць імперыялістычны характар Часовага ўрада, выкрыць прэдацельства эсэраў і меншавікоў і паказаць, што дабіцца міру немагчыма без замены Часовага ўрада ўрадам Советаў.

І партыя большэвікоў узялася за гэту работу з усёй энергіяй.

Яна аднаўляе свае легальныя органы друку. Ужо праз пяць дзён пасля лютаўскай рэволюцыі пачынае выходзіць газета «Правда» ў Петраградзе, а праз некалькі дзён пасля гэтага — «Социал-демократ» у Маскве. Партыя пачынае выступаць на чале мас, асвабаджаючыхся ад давер'я да ліберальнай буржуазіі, ад давер'я да меншавікоў і эсэраў. Яна цярпліва растлумачвае салдатам, сялянам неабходнасць сумесных дзеянняў з рабочым класам. Яна растлумачвае ім, што сяляне не атрымаюць ні міру, ні зямлі без далейшага развіцця рэволюцыі без замены буржуазнага Часовага ўрада ўрадам Советаў.

КАРОТКІЯ ВЫВАДЫ

Імперыялістычная вайна ўзнікла ў сілу няроўнамернасці развіцця капіталістычных краін, у сілу нарушэння роўнавагі паміж галоўнымі дзяржавамі у сілу неабходнасці для імперыялістаў новага перадзелу свету шляхам вайны і стварэння новай роўнавагі сіл.

Вайна не мела-б такога разбуральнага характару і, можа быць, нават зусім не разгарнулася-б з такой сілай, калі-б партыі II Інтэрнацыянала не здрадзілі справе рабочага класа калі-б яны не парушылі рашэнняў Кангрэсаў II Інтэрнацыянала супроць вайны, калі-б яны рашыліся актыўна выступіць і падняць рабочы клас супроць сваіх імперыялістычных урадаў, супроць падпальшчыкаў вайны.

Большэвіцкая партыя аказалася адзінай пролетарскай партыяй, якая асталася вернай справе социялізма і інтэрнацыяналізма і арганізавала грамадзянскую вайну супроць свайго імперыялістычнага ўрада. Усе астатнія партыі II Інтэрнацыянала будучы звязаны з буржуазіяй праз свае кіруючыя вярхушкі аказаліся ў палоне ў імперыялізма, перабеглі на бок імперыялістаў.

Будучы адлюстраваннем агульнага крызіса капіталізма вайна абвастрыла гэты крызіс і аслабіла сусветны капіталізм. Рабочыя Расіі і партыя большэвікоў аказаліся першымі ў свеце, якія з поспехам скарысталі слабасць капіталізма, прарвалі фронт імперыялізма, скінулі цара і стварылі Советы рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Ап'янёныя першымі поспехамі рэволюцыі і супакоеныя запэўненнямі меншавікоў і эсэраў, што з гэтага часу ўсё пойдзе добра, шырокія масы дробнай буржуазіі, салдат, а таксама рабочых пранікаюцца давер'ем да Часовага ўрада, аказваюць яму падтрыманне.

Перад большэвіцкай партыяй паўстала задача — растлумачыць ап'янёным ад першых поспехаў рабочым і салдацкім масам, што да поўнай перамогі рэволюцыі яшчэ далёка, што пакуль улада знаходзіцца ў руках буржуазнага Часовага ўрада, а ў Советах гаспадарыць згодніцкі, — меншавікі і эсэры народу не атрымаць ні міру, ні зямлі, ні хлеба, што для поўнай перамогі неабходна зрабіць яшчэ крок наперад і перадаць уладу Советам.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

АВАНГАРДНАЯ РОЛЯ КОМУНІСТАЎ НА ТАКТЫЧНЫХ ВУЧЭННЯХ

Часць дзе камісарам тав. Вырвіч на асенніх тактычных вучэннях паказала высокую самаадданасць, уменасць у дзеянні і вялікую фізічную выносліваасць байцоў і камандзіраў, якія як ніколі, па-большэвіцку, з уласцівай ім скромнасцю чотка выконвалі ўзятыя на сябе абавязацельствы.

Падраздзяленне, якім камандуе тав. Калін змяніўшыся з сутачнага нарала ўзорна зрабіла марш. У часе пераходу 42 кілометраў у начных умовах па пясчанай мясцовасці не было ні аднаго адстаючага, не было страт.

Комуністы былі ў авангардзе выканання ўсіх пастаўленых задач. Кандыдат ВКП(б) тав. Саўчын на прывалах расказаў байцам асобныя эпізоды з падзей у раёне возера Хасан і гераічнай барацьбе далёкаўсходнікаў з японскімі самураямі. Кандыдат партыі тав. Бондараў расказваў байцам першага года службы аб добра праведзеных вучэннях у мінулым годзе, калі пры пераходзе ў 500 кілометраў не было ні аднаго адстаючага.

Усе комуністы і комсамольцы перад выхадам на вучэнні атрымалі пэўныя заданні. Правільная расстаноўка актыва адразу-ж дала вынікі. У часе марша 4 чырвонаармейцы падалі заявы ў спачуваючыя, 2 чалавекі — у кандыдаты ВКП(б) і 1 чалавек — у комсамол. Добра абстаяла справа і ў іншых падраздзяленнях.

У часе вучэнняў комуністы і комсамольцы гралі вядучую ролю. Асабліва адзначыўся лейтэнант тав. Чынчаладзе, нядаўна прыняты ў кандыдаты ВКП(б). Сваё падраздзяленне ён не раз умела выводзіў з акружэння «праціўніка» быў заўсёды напередадзе, усе загады выконваў дакладна. Пры заняцці лініі абароны падраздзяленне першым вырыла акопы па ўсіх правілах і добра замаскіравала іх.

Баец т. Філгошын з падраздзялення якім камандуе тав. Пчолаў (на вучэннях працаваў інфарматарам і рэдактарам «Баявога лістка»), заяўляе:

— Я працаваў з кожным байцом у паасобку, растлумачваў ім пастаўленыя перад аддзяленнем задачы, у рэзультаце чаго наша аддзяленне атрымала добрую ацэнку.

Камандзір аддзялення тав. Давыдаў непасрэдна ў акопе выпускаў «Баявы лісток» чытаў байцам газеты рэгулярна, падводзіў вынікі сацыялістычнага спаборніцтва. Яго аддзяленне не спаўшы тры ночы добра выканала задачу па заняццю лініі абароны. Тав. Давыдаў падаў заяву аб прыёме яго ў кандыдаты ВКП(б).

Байцы і камандзіры праяўлялі сапраўды большэвіцкую пільнасць. На тэрыторыі размяшчэння часці паявіўся падазроны чалавек, які распытваў байцоў аб размяшчэнні часцей. Байцы неадкладна паведамілі аб гэтым аднаго з камандзіраў. Незнаёмы бачачы, што яго хочуць затрымаць пусціўся ўцякаць, але ў калгасным свірне быў затрыман калгаснікам-конюхам і аказаўся шпіёнам.

Можна прывесці мноства прыкладаў, як партыйна-палітычная работа забяспечвала выкананне пастаўленых задач.

Радасна і ветліва сустрэла часці насельніцтва калгасаў.

Калгасніца сельгасарцелі «Парыжская комуна» Дорыта Юзэфа частавала чырвонаармейцаў яблыкамі і гуркамі, заяўляючы: «армію трэба паважаць, яна ёсць кроўна народная армія, якая аберагае нашу мірную працу».

Тактычныя вучэнні паказалі, што наша часць знаходзіцца ў поўнай мабілізацыйнай гатоўнасці, у любую мінуту па першаму закліку партыі і ўрада, па загаду сталінскага наркома абароны Клімента Ефрэмавіча Варашылава гатова выступіць на абарону нашай шчаслівай социялістычнай радзімы і граміць ворага на яго-ж тэрыторыі.

Н. ВАГАНАЎ, Г. ЗОЛАТЦАЎ.

—o—

Семінар прапагандыстаў і агітатараў

ОРША, 19 верасня. У парткабінеце палітаддзела Аршанскага чыгуначнага аддзялення для прапагандыстаў і агітатараў быў праведзен семінар па вывучэнню Кароткага курса гісторыі ВКП(б). Прысутнічаўшыя на семінары прапагандысты і агітатары з вялікай увагай праслухалі лекцыю тав. Сцёпіна — прапагандыста палітаддзела Заходняй чыгункі.

Тав. Сцёпін ярка расказаў аб новым вучэбніку па гісторыі партыі, дзе дана запраўды навуковае, маркісісцкае тлумачэнне складанейшых пытанняў гісторыі рэволюцыйнай барацьбы рабочага класа, гісторыі яго партыі.

Прапагандысты і агітатары асталіся задаволенымі лекцыяй і пажадалі, каб такія семінары практыкаваліся часцей.

А. КЛЕПЧА.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ГЛЫБОКАГА ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ ВКП(б)

(У парткабінетах Масквы)

Партыйныя кабінеты сталіцы праводзяць значную работу па падрыхтоўцы да глыбокага вывучэння гісторыі ВКП(б).

Парткабінет МК і МГК ВКП(б) падбірае зараз літаратуру і матэрыялы да кожнага раздзела гісторыі ВКП(б).

Пры парткабінеце для прапагандыстаў будуць прачытаны лекцыі па асобных творах Леніна і Сталіна.

Партыйны кабінет Пролетарскага райкома ВКП(б), апрача выстаўкі наглядных дапаможнікаў арганізуе зараз у дапамогу прапагандыстам групавую і індывідуальную кансультацыю па пытаннях гісторыі партыі. Для гэтай работы вылучаны вопытныя кансультанты.

На маскоўскім заводзе «Динамо» імя Кірава пры партыйным кабінеце ствараюцца тры семінары для прапагандыстаў сеці партыйна-комсамольскай асветы. У іх будуць навучацца 48 чалавек. Апрача таго, рад прапагандыстаў будзе займацца ў раённым семінары. (БЕЛТА).

—o—

У МЕНСКІМ АБКОМЕ

Менскі абком КП(б)Б распрацоўвае мерапрыемствы па падрыхтоўцы кадраў прапагандыстаў для выкладання Кароткага курса гісторыі ВКП(б). Па ўсіх раёнах вобласці да 1 кастрычніка будуць праведзены 2-дзённыя семінары прапагандыстаў з адрывам ад вытворчасці, на якіх будуць глыбока прапрацаваны першы і другі раздзелы Кароткага курса гісторыі ВКП(б).

Для кіраўніцтва семінарамі вылучана група высокакваліфікаваных прапагандыстаў — выкладчыкі ВНУ, курсаў прапагандыстаў, аспіранты і інш.

—o—

ПАДРЫХТОЎКА ПРАПАГАНДЫСЦКІХ КАДРАЎ

Для падрыхтоўкі прапагандыстаў горада Менска пры Доме партыйнай асветы (г. Менск) арганізаван семінар прапагандыстаў, які будзе працаваць тры разы ў месяц з адрывам ад вытворчасці.

21 верасня адбыліся першыя заняткі. У гэты дзень працавалі тры групы з захватам 100 чалавек. На працягу чатырох гадзін слухачы семінара прапрацоўвалі першы раздзел Кароткага курса гісторыі ВКП(б) і дзве гадзіны вывучалі палітычную карту свету.

На занятках прапагандысты атрымліваюць тэарытычную падрыхтоўку і метадычныя ўказанні.

ЗА ЎЗОРНЫ ОПЕРНЫ ТЭАТР

Беларускі Дзяржаўны тэатр оперы і балета з'яўляецца адным з самых маладых тэатраў Совецкага Саюза.

Менскае музыкальнае вучылішча залажыла аснову Беларускага тэатра оперы і балета, створанага ў 1932 г. З гэтага моманту пачынаецца складаны шлях стварэння сапраўднага творчага арганізма, закліканага быць цэнтрам музыкальна-вакальнай культуры ордэнаноснай Беларусі. За шэсць год свайго існавання тэатр прайшоў выключна цяжкі шлях развіцця. Ворагі, якія ўзначальвалі фронт мастацтва, да апошняга часу стараліся сваю подлую руку прыкласці у першую чаргу к опернаму тэатру Тэатр, не маючы будынка, быў вымушан перакідвацца на розныя сцэнічныя пляцоўкі, ад 6 да 10 месяцаў у годзе быў пастаўлен на кансервацыю

Шлях тэатра цярністы, адзначан зігзагамі, памылкамі, але гэта толькі ўмацоўвала яго калектыў у барацьбе за стварэнне сапраўднага тэатра, нацыянальнага па форме, соцыялістычнага па зместу.

Праз памылкі ў пастаноўках опер «Залаты пятушок», «Пікавая дама», «Севільскі цырульнік», «Карман».—тэатр перайшоў да новага станоўчага этапа — пастаноўкі «Рыгалето», «Тоска» (рэж. Златагораў), навучыўшага акторaў правільна падыходзіць да стварэння сцэнічнага вобраза.

Побач з мясцовымі кадрамі, на дапамогу тэатру прышлі прадстаўнікі мастацтва вялікага рускага народа. Яны ва многім садзейнічалі творчаму росту тэатра.

Побач з операй ствараўся балет. Балетны калектыў тэатра вырас са студыі, створанай пры тэатры. У апошнія годы яна папоўнілася радам кваліфікаваных актораў, як Васільева, Нікалаева, Мулер, Бабанін і інш.

Адным з буйных недахопаў тэатра з'явілася адсутнасць да апошняга часу пастаяннага мастацкага кіраўніцтва, без якога немагчыма стварэнне сапраўднага творчага арганізма.

У сучасны момант ёсць усе ўмовы для работы тэатра.

Урад БССР, ЦК КП(б)Б аказваюць штодзённую дапамогу нашаму тэатру, і гэта абавязвае калектыў прыкласці ўсе намаганні к таму, каб у БССР быў створан высока-мастацкі тэатр оперы і балета.

У тэатр запрошан галоўны рэжысер В. Р. Рапапорт, галоўны дырыжор ордэнаносец Н. Т. Грубін, запрошан рад вядучых работнікаў Тэатр атрымлівае вялікія сродкі. 25 кастрычніка будзе закончан будынак новага тэатра. Але асваенне гэтага новага будынку патрабуе вялікага перыяда, таму вырашана работу тэатра пачаць на малой сцэне яўрэйскага тэатра з тым, каб адначасова асвойваць новую сцэну, роўную сцэне Вялікага тэатра СССР і ўжо ў студзені паказаць там свае спектаклі.

Зараз работа ў тэатры ідзе ўзмоцненымі тэмпамі. У кастрычніку месяцы ён пачне паказваць свае спектаклі на сцэне яўрэйскага тэатра. К гэтаму часу тэатр падрыхтуе дзве новыя пастаноўкі: оперу «Царская нявеста» (рэжысер Рапапорт, дырыжор Грубін, мастак Нікалаеў) і балет «Лебядзінае возера» (балетмейстар Мулер, дырыжор Ратнер, мастак Матрунін). З старога рэпертуару тэатр адновіць «Ціхі Дон», «Тоску», «Рыгалето», «Марная перасцярога» Да студзеня тэатр выпусціць яшчэ дзве прэм'еры — «Чыо-Чыо-Сан» (рэжысер Літвінаў, дырыжор Шнейдэрман, мастак Малкін) і «Русалка» (рэжысер Рапапорт дырыжор Грубін мастак Панадыані). 1939 год з'явіцца рашаючым годам для стварэння творчага твару тэатра Побач з работай над класічным рэпертуарам тэатр асноўную сваю ўвагу зверне на стварэнне беларускай арыгінальнай оперы і балета.

У сучасны момант заканчваецца ў асноўным работа над операй «Міхась Падгорны» (музыка Цікоцкага, лібрэта Броўкі), якой адкрыецца новы тэатр. Работа кампазітара праходзіць ў цесным кантакце з тэатрам. Сумесна з кампазітарам працуе дырыжор тэатра М. Э. Шнейдэрман. Вопыт работы над гэтай операй паказаў, што сумесная творчая работа дырыжора з кампазітарам дае добрыя рэзультаты Услед за гэтай операй будзе паказан балет «Салавей» — кампазітар Крошнер, лібрэта Слонімскага Затым тэатр выпусціць оперу «Дрыгва» кампазітара дэпутата Вярхоўнага Совета БССР Багатырова, лібрэта Рамановіча па аповесці Якуба Коласа Апошняй пастаноўкай гэтага сезона будзе балет «Бахчысарайскі фантан».

Увосень 1939 г. тэатр пакажа оперу «Большэвікі граніцы» (музыка кампазітара дэпутата Вярхоўнага Совета БССР Туранкова, лібрэта пісьменніка-пагранічніка Шапавалава), а затым «Кацярына Жарнасек» — кампазітар Шчаглоў, лібрэта Клімковіча.

Апошняй пастаноўкай 1939 года з'явіцца опера «Барыс Гадуноў» — Мусоргскага. Апрача таго, з малой сцэны на вялікую будуць перанесены оперы «Ціхі Дон», «Русалка» балеты «Лебядзінае возера» і «Марная перасцярога».

У сучасны момант ужо зацверджаны пастановачныя брыгады опер У бліжэйшыя дні будуць зацверджаны мастакі пастановак і пастановачная брыгада оперы «Дрыгва». Для дапамогі беларускім мастакам запрашаецца буйны маскоўскі мастак

Апрача галоўнага рэжысера т. Рапапорта да пастаноўкі опер будуць прыцягнуты мясцовыя рэжысеры т.т. Літвінаў, Рахленка і Зораў. Побач з мастакамі Федароўскім, Матруніным, Нікалаевым. Каровіным і Панадыані будуць працаваць мясцовыя мастакі. Да пастаноўкі балетаў апрача балетмейстара Мулера будзе прыцягнут Лопухаў і інш

Акрамя пералічаных опер Беларускім оперным тэатрам прымаюцца меры к напісанню новых Кампазітару Падкавыраву заказана опера «Як гартавалася сталь» па Н Остроўскаму, лібрэта Юдылевіча. Заказаны лібрэта паэтам Шарапаву, Глебку і Броўку. Падрыхтоўваецца матэрыял для стварэння новага балета.

Пры тэатры створан Мастацкі совет куды ўваходзяць апрача вядучых работнікаў тэатра беларускія кампазітары, пісьменнікі, паэты, мастакі, рэжысеры.

Тэатр устанаўлівае цесную сувязь з фабрыкамі і заводамі. У бліжэйшы час мяркуецца выезд тэатра непасрэдна на прадпрыемствы, дзе будуць паказаны беларускія оперы «Міхась Падгорны», «Кацярына Жарнасек» і інш. Пасля праслухоўвання будзе арганізавана абмеркаванне рыхтуючыхся опер.

Вялікая работа праводзіцца па падрыхтоўцы да 20-гадовага юбілею ВЛКСМ. Рыхтуецца рад канцэртных брыгад, а таксама ўпершыню будзе паказана моладзі опера «Міхась Падгорны» у канцэртным выкананні.

Унутры калектыва разгортваецца палітвучоба і заняткі па павышэнню творчай кваліфікацыі. Заняткі праводзяцца ва ўсіх творчых калектывах.

У тэатры разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва паміж калектывамі за лепшую падрыхтоўку да адкрыцця сезона. Перадавому калектыву будзе ўручан пераходны чырвоны сцяг.

Калектыў тэатра адчувае ўсю велізарную адказнасць, якая стаіць перад ім на гэтым чарговым этапе. і поўны энергіі, рашучасці і жадання апраўдаць давер'е партыі і ўрада.

Уся беларуская грамадскасць і, у першую чаргу, совецкія арганізацыі (у прыватнасці горсовет) павінны пранікнуцца сазнаннем таго, што тэатр оперы і балета БССР трэба ўсімі сіламі падтрымліваць у перыяд яго бурнага росту Трэба памятаць што наяўнасць такога тэатра з'яўляецца калясальным фактарам развіцця культурнага жыцця орлэнаноснай Беларускай рэспублікі, ён патрабуе да сябе неадкладнай і дзейснай увагі.

О. А ГАНТМАН,
дырэктар Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ ПЛАНАВЫХ РАБОТНІКАЎ

Соўнарком БССР дазволіў Дзяржплану склікаць месячныя курсы па павышэнню кваліфікацыі работнікаў раённых і акруговых планавых камісій. Курсы будуць праведзены ў два тэрміны—да 20 лістапада, усяго на 100 чал.

У рэспубліканскай Іспаніі. НА ЗДЫМКУ: маладыя сялянкі рэспубліканскай Іспаніі. (СФ).

ЖАНЧЫНЫ АВАЛОДВАЮЦЬ ТЭХНІКАЙ КІРАВАННЯ ЛАКАМАТЫВАМ

ОРША, 21 верасня. **(Па тэлефону).** Заклік знатнага машыніста СССР — ордэнаноскі Зінаіды Троіцкай — да актывістак чыгуначнага транспарта аб авалодванні тэхнікай ваджэння паравоза знайшоў жывы водгук сярод жанчын Аршанскага вузла.

З радасцю была сустрэта вестка аб тым, што па ініцыятыве любімага наркома таварыша Л М Кагановіча на транспарце у тым ліку і на Аршанскім вузле, арганізоўваюцца спецыяльныя жаночыя курсы памочнікаў машыністаў. Кіраўніцтва паравознага дэпо атрымлівае ад жанчын шмат заяў ад прыёме на гэтыя курсы. Паступілі ўжо 63 заявы, у тым ліку ад стрэлачніка станцыі Орша-цэнтральная тав. Марыі Шакалавай, распэпшчыц паравознага дэпо тт. О. Прыгода і В. Маляўка, раздатчыцы газет тав. П. Пахамовіч і інш.

У аршанскім паравозным дэпо ў якасці памочніка машыніста працуе жанчына—тав. Голубева, якая рыхтуецца да заняткаў, каб атрымаць кваліфікацыю машыніста.

А. К.

* * *

ГОМЕЛЬ Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі арганізавала курсы па падрыхтоўцы жанчын-машыністаў і памочнікаў машыністаў На курсах без адрыву ад вытворчасці будуць займацца работніцы станцыі і жонкі чыгуначнікаў

Аб жаданні займацца на курсах машыністаў паступілі ўжо заявы ад 15 чалавек. Днямі на курсах распачнуцца заняткі.

АНСАМБЛЬ РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ ВЯРНУЎСЯ У МЕНСК

Ансамбль беларускай народнай песні і пляскі клуба «Чырвоны будаўнік» вярнуўся ў Менск з гастрольнай паездкі па новабудоўлях БССР За 20 дзён ансамбль даў больш 14 канцэртаў, якія прайшлі з вялікім поспехам.

Удзельнікі ансамбля выязджалі ў Маскву, куды яны былі запрошаны для канцэртных выступленняў перад рабочымі-будаўнікамі сталіцы. Адзін канцэрт быў імі дан у Калонным зале Дома саюзаў для ўдзельнікаў пленума ВЦСПС.

20 верасня ансамбль у парадку падрыхтоўкі да XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі выступаў ля мікрафона ў Менску як удзельнік радыёконкурса на лепшы самадзейны мастацкі гурток.

СТУДЭНЦКІЯ ФІЗКУЛЬТУРНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

Студэнты Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя В В Куйбышэва ў адзнаку новага вучэбнага года наладзілі на стадыёне «Харчавік» фізкультурныя спаборніцтвы па пяцібор'ю. У спаборніцтвах прымала ўдзел каля 300 чалавек. Студэнты паказалі выдатныя поспехі ў мятанні гранат. Так тав Каравай мятнуў гранату на 51,4 метра, тав. Грашчанка на 31,2 метра. У бегу першае месца заняў студэнт 4 курса планавага факультэта тав Сянкевіч. Дыстанцыю ў тысячу метраў ён прабег за 2 мінуты 49 секунд. Тав Сянкевіч здаў нормы на ўсе абаронныя значкі, скончыў курс лётнай вучобы без адрыву ад вытворчасці, ён выдатнік. Па прыжках у даўжыню першае месца заняў тав. Фрадкін, па прыжках у вышыню — тав. Запоць.

Я. КОРЖЫКАЎ.

КЛОПАТЫ АБ ДЗЕЦЯХ

41 тысяча дзяцей БССР адпачывалі летам у піонерскіх і санаторных лагерах. У дачных прыгожых месцах, у сасновых лясах рэспублікі было разгорнута 219 лагераў. У бягучым годзе значна палепшылася харчаванне дзяцей і іх абслугоўванне У лагеры былі накіраваны для работы кваліфікаваныя кадры педагогаў, выхавальнікаў медыцынскіх работнікаў.

Апрача таго 20 тысяч дзяцей абслужаны школьнымі пляцоўкамі ў гарадах і раёнах. Больш тысячы школьнікаў—выдатнікаў вучобы з самых аддаленых раёнаў БССР на працягу лета пабывалі на экскурсіях у сталіцы БССР, дзе знаёміліся з музеямі, тэатрамі Цэнтральнай тэхнічнай дзіцячай станцыяй і іншымі выдатнасцямі горада.

На летні адпачынак дзяцей у БССР затрачана да 9 мільёнаў рублёў.

НА ПЯРШЫНСТВА ТАВАРЫСТВА „ЛАКАМАТЫЎ"

У Гомелі адбыўся футбольны матч на пяршынства спартыўнага таварыства «Лакаматыў» На зялёным полі стадыёна сустрэліся каманды Дзержынскай і Беларускай чыгунак.

Матч закончыўся перамогай футбольнай каманды Дзержынскай чыгункі з лікам 3 : 2.

ЧЭМПІЁНЫ БССР ПА ТЭНІСУ

У Менску закончыліся ўсебеларускія спаборніцтвы на пяршынства БССР па тэнісу, у якіх прынялі ўдзел 19 мацнейшых тэнісістаў рэспублікі.

Першае месца і званне чэмпіёна БССР сярод мужчын заваяваў тав Пусцякоў (менскі Дом Чырвонай Арміі) На другім месцы — былы чэмпіён БССР тав Анікін (Менск. «Спартак»).

Званне чэмпіёна БССР сярод жанчын заваявала студэнтка менскага політэхнічнага інстытута т. Муская.

СТАНОВІШЧА Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

РАШЭННЕ ЧЭХАСЛАВАЦКАГА ЎРАДА

ПРАГА, 20 верасня, (БЕЛТА). У сувязі з паявіўшымися ў замежным друку чуткамі аб тым, нібы чэхаславацкі ўрад прыняў прапановы Англіі і Францыі, чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва рашуча абвяргае гэтыя чуткі, як не адпавядаючыя сапраўднасці.

Рашэнне чэхаславацкага кабінета міністраў, які засядаў увесь дзень, па пытанню аб англа-французскіх прапановах не апублікавана. У афіцыяльным камюніке чэхаславацкага тэлеграфнага агенцтва ўказваецца, што чэхаславацкі ўрад перадаў пасланнікам Францыі і Англіі ноту, у якой паведамляецца аб адносінах чэхаславацкага ўрада да пераданых яму англійскім і французскім ураламі прапаноў. Па словах камюніке, адказ чэхаславацкага ўрада дае магчымасць вядзення далейшых дыпламатычных перагавораў «у духу прымірэння, якое чэхаславацкі ўрад заўсёды праяўляў».

Як паведамляюць з асведомленых журналісцкіх кругоў, сутнасць рашэння кабінета міністраў зводзіцца да наступнага:

1. Чэхаславацкі ўрад не можа адразу даць адказ на англа-французскія прапановы, бо для вырашэння пытання, звязанага з тэрытарыяльнымі змяненнямі, на якіх настойваюць Англія і Францыя, неабходна рашэнне парламента і змяненне чэхаславацкай канстытуцыі. А гэта патрабуе больш працяглага тэрміну.

2. Калі пытанне разглядваць, як выходзячае за рамкі чэхаславацкай дзяржавы і як спрэчнае паміж Германіяй і Чэхаславакіяй, то чэхаславацкі ўрад прапануе звярнуцца да арбітражнага дагавора, заключанага паміж абодвума дзяржавамі ў 1925 годзе (згодна гэтага дагавора абедзве стораны вызначаюць арбітражную камісію з прадстаўнікоў трох дзяржаў, прызнаных як Германіяй, так і Чэхаславакіяй аб'ектыўнымі для вырашэння спрэчак).

УЗБРОЕНЫЯ НАЛЕТЫ ГЕНЛЕЙНАЎСКІХ ПРАВАКАТАРАЎ

ПРАГА, 20 верасня. (БЕЛТА). У ноч на 20 верасня і сёння днём у радзе месц узброеныя банды генлейнаўцаў, прыбыўшыя ў Чэхаславакію з германскай тэрыторыі, зрабілі налёты на памяшканні жандармскага ўпраўлення і іншыя дзяржаўныя ўстановы. У горадзе Габартычы каля Фрыдланда банда ў 18 чалавек напала на таможанае і жандармскае ўпраўленні. Пры дапамозе ручных гранат часці жандармерыі прагналі банду генлейнаўцаў. У пасёлку Дуб бандыты пакалечылі паставога салдата чэхаславацкай арміі. У горадзе Старасціне ўзброеная банда ў 13 чалавек зрабіла налёт на жандармскае ўпраўленне, пошту, тэлеграф і будынак муніцыпалітэта. Прыбыўшым у браніраваным аўтамабілі атрадам жандармаў і салдат банда была выпеснена з пасёлка. Ранена 6 жандармаў.

Аналагічныя факты мелі месца і ў радзе іншых пунктаў Паўднёвай Чэхіі.

У сувязі з гэтым чэхаславацкі ўрад вынес рашэнне аб увядзенні ў дзеянне асобага суда ў акругах Фрыдланда, Трутнова і Брумана. Асобыя суды дзейнічаюць у 19 акругах.

* * *

ПРАГА, 20 верасня, (БЕЛТА). Учора ў Дрэздэне адбыўся сход упёкшых у Германію 20 тысяч генлейнаўцаў, сфарміраваных у так званы «Судэта-нямецкі корпус». На сходзе з прамовамі выступалі лідэры генлейнаўцаў Себекоўскі і Занднер, якія заявілі, што ў бліжэйшыя дні «судэта-нямецкі корпус», створаны і кіруемы германскай арміяй, уступіць у Судэцкую вобласць і са зброяй у руках ажыццявіць далучэнне вобласці да Трэцяй імперыі.

ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНЫ ПЛАН РАСЧЛЯНЕННЯ ЧЭХАСЛАВАКІІ

ВОДГУКІ ЗАМЕЖНАГА ДРУКУ

ПАРЫЖ, 20 верасня. (БЕЛТА). Французская грамадская думка ў мацнейшай ступені абурана вынікамі нарады англійскіх і французскіх міністраў у Лондане. Нават некаторыя крайне правыя і рэакцыйныя выданні накшталт «Журнэ эндустрыель» вымушаны прызнаць, што на працягу апошніх двух сутак у Францыі «прыходзіцца чытаць і чуць аб рэчах, якія ні адзін француз не можа ні чытаць, ні слухаць не чырванеючы».

Анры дэ Керыліс у газеце «Эпок» піша: «Зусім няправільна тое, што, прадаючы Чэхаславакію, мы выратоўваем мір. Мы будзем ізаляваны больш, чым калі-небудзь. Ці не падбадзёрыць усё гэта Германію накінуцца на нас пры першай магчымасці? Усё што нам вядома аб гітлераўскай Германіі, прымушае гэтага апасацца».

Эміль Бюрэ ў правай газеце «Ордр» заяўляе, што лонданскае пагадненне з'яўляецца «абсурдам» і што яно «бясчэсна».

* * *

ЛОНДАН 20 верасня (БЕЛТА). Галоўнай хвалюючай тэмай сёнешняга дня ў Лондане з'яўляецца англа-французскі план расчлянення Чэхаславакіі. Гэты план сустрэт англійскім народам з пачуццём глыбокага абурэння. Усюды гавораць аб тым што «Гітлер атрымаў усё, што ён патрабаваў», «англійскія і французскія міністры зрабілі здрадніцтва».

Карэспандэнт газеты «Манчэстэр гардыян» заяўляе, што англа-французскі план расчлянення Чэхаславакіі літаральна ўскалыхнуў усю краіну.

Па словах палітычнага аглядальніка газеты «Дэйлі экспрэс», Гітлер ужо адобрыў выпрацаваныя прапановы і астаецца толькі высвятліць пазіцыю Чэхаславакіі

Дыпламатычны аглядальнік газеты «Манчэстэр гардыян» піша, што разлікі Англіі і Францыі на тое, што Гітлер задаволіцца далучэннем Судэцкай вобласці да Германіі, з'яўляецца простым ашуканствам.

ПРЫЁМ ГІТЛЕРАМ ВЕНГЕРСКІХ МІНІСТРАЎ

ЛОНДАН, 20 верасня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення агенцтва Рэйтэр з Берліна, Гітлер сёння прыняў у Берхтэсгадэне венгерскага прэм'ера Імрэдзі і міністра замежных спраў Канія.

Венгерскія міністры сёння-ж вярнуліся ў Будапэшт.

ЗАЯВА НАЦЫЯНАЛЬНАГА СОВЕТА ПРАЦЫ АНГЛІІ

ЛОНДАН, 20 верасня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення агенцтва Рэйтэр, Нацыянальны совет працы (аб'яднаны совет трэд-юніёнаў, выканкома і парламенцкай фракцыі лейбарыстскай партыі) апублікаваў заяву, у якой рэзка выступае супроць англа-французскага плана расчлянення Чэхаславакіі. Англа-французскія прапановы аб расчлянені Чэхаславакіі, прынятыя без папярэдняга абмеркавання іх з чэхаславацкім урадам, гаворыцца ў заяве, з'яўляецца здрадніцтвам ў адносінах да мірнага дэмакратычнага народа і ствараюць вельмі небяспечны прэцэдэнт для будучага. Нацыянальны совет працы выражае сваё глыбокае спачуванне чэхаславацкаму народу.

Сёння Нацыянальны совет працы засядаў сумесна з прадстаўнікамі французскай соцыялістычнай партыі, французскіх профсаюзаў. Другога Інтэрнацыянала і Міжнароднага аб'яднання профсаюзаў. На гэтым пасяджэнні абмяркоўвалася чэхаславацкае пытанне.

Ніякага паведамлення аб ходзе пасяджэння не апублікавана.

Вык. абавязкі адказнага рэдактара
Д. Т ЛЕБЕДЗЕЎ.

Кінотэатр «Чырвоная зорка» Прафесар МАМЛОК

Дзіцячы кінотэатр ДЗЯЦІНСТВА ГОРКАГА

Кіно «Парыжская Комуна» (Цэнтр. парк культуры і адпачынку) АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Кіно «Спартак» ВЯСЕЛЫЯ РЭБЯТЫ

Кінотэатр «Інтэрнацыянал» ЦЫРК

Кінотэатр «Навіны дня» 1 Памяці Станіслаўскага. 2 Журнал «Піонерыя» № 7.

ГАСТРОЛІ ВІЦЕБСКАГА ВЕЛДЗЯРЖТЭАТРА (Памяшк. Велдзярждрамтэатра)

22 верасня
ДЗЕЦІ ВАКЮШЫНА

Пачатак а 6 гадзін веч.
Каса адкрыта а 12 да 2 г. дня і а 5 да 8 г. веч.

24 ВЕРАСНЯ Ў Г. МЕНСКУ Ў ПАРКУ ІМЯ ГОРКАГА
ПРАВОДЗІЦЦА
1-я АБЛАСНАЯ ВЫСТАЎКА САБАК усіх парод.
ЛЕПШЫМ САБАКАМ БУДУЦЬ ВЫДАНЫ ДЫПЛОМЫ НА МЕДАЛІ, А ТАКСАМА БУДУЦЬ ПРЭМІРАВАНЫ ГРАШОВЫМІ ПРЫЗАМІ.
ПРАВОЗ САБАК І ПРАЕЗД ПРАВАДНІКОЎ З РАЁНАЎ НА ВЫСТАЎКУ АПЛАЧВАЕЦЦА РАЙЗА.
НА ВЫСТАЎКУ ЗАПРАШАЮЦЦА ЎСЕ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРЫВАТНЫЯ АСОБЫ, ЯКІЯ МАЮЦЬ Ў СЯБЕ КРОЎНЫХ САБАК, ПАЛЯЎНІЧА-ПРАМЫСЛОВЫХ І СЛУЖЭБНА-ВАРТАВЫХ ПАРОД.
ВЫСТАЎКОМ.

РАЗВОДЗЬЦЕ КРОЛІКАЎ!
КАЛГАСЫ, КАЛГАСНІКІ, АДНААСОБНІКІ, РАБОЧЫЯ, СЛУЖАЧЫЯ!
БЕЛЗАГОТПУШНІНА
ПРЫСТУПІЛА да ПРОДАЖУ ЖЫВЫХ КРОЛІКАЎ ДЛЯ РАЗВЯДЗЕННЯ
Загатоўчыя цэны на кролікавыя шкуркі ПАВЫСІЛІСЯ:
за шкурку пародзістага кроліка— 7 руб 40 кап.,
за шкурку беспароднага кроліка— 5 руб 40 кап.
Адначасова з продажам жывых кролікаў ПРАВОДЗІЦЦА КАНТРАКТАЦЫЯ МАЛАДНЯКА з выдачай грашовага аванса
КУПІЦЬ ЖЫВЫХ КРОЛІКАЎ МОЖНА Ў ЛЮБЫМ РАЁННЫМ ЗАГАТОЎЧЫМ ПУНКЦЕ БЕЛЗАГОТПУШНІНЫ.

БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНТОРА
„САЮЗУЦІЛЬ"
Менск, вул. Дзем'яна Беднага, 8, тэл. 22-185, 22-186.
ПРАВОДЗІЦЬ ЗАГАТОЎКУ УЦІЛЬЖЫЎСЫРАВІНЫ:
ТРАП'Е СТАРУЮ ПАПЕРУ СТАРЫ ГУМАВЫ АБУТАК, КОСЦЬ, КАЛЯРОВЫ МЕТАЛ, ПАКЛЮ, СТАРЫЯ КАНСЕРВАВЫЯ БАНКІ, ПРОМАДЫХОДЫ, ШЧАЦІНУ, КОНСКІ ВОЛАС, ПУХ-ПЯРО, РОГСЫРАВІНУ ФРУКТОВЫЯ КОСТАЧКІ І ІНШ ВІДЫ.
ЗАГАТОЎКА вядзецца ПРАЗ ЗВОРШЧЫКАЎ ФУРГОНШЧЫКАЎ, АГЕНТАЎ І ДАРКІ ЯК У ГАРАДАХ, ТАК І НА ВЕСЦЫ.
ПРЫ ЗДАЧЫ ЎЦІЛЬЖЫЎСЫРАВІНЫ ПАТРАБУЙЦЕ ПРЭЙСКУРАНТ ЦЭН, зацверджаных Наркомлегпромам СССР.
ЗАХОЎВАЙЦЕ ВАШ ХАТНІ УЦІЛЬ І ПРАДАВАЙЦЕ ЯГО САЮЗУЦІЛЮ.
ВА ЎСІХ ГАРАДАХ І РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ «САЮЗУЦІЛЬ» МАЕ СВАЕ ЗАГАТОЎЧЫЯ КАНТОРЫ.
Паведамляйце Ваш адрас канторам і да Вас прыедуць за уцілем.
БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНТОРА «САЮЗУЦІЛЬ».

Да ўвагі школ, навучальных устаноў і воінскіх часцей!
МАГАЗІН МАСТАЦКАЙ ПРАДУКЦЫІ КОГІЗ'а
(МЕНСК. СОВЕЦКАЯ, 73. ТЭЛ. 23-712)
ЕСЦЬ У ПРОДАЖУ І высылаюцца наложаным плацяжом:
ГЕАГРАФІЧНЫЯ КАРТЫ.
Еўропа палітыч. — пана 28 р. і 23 р. Еўропа фізіч.—20 р. СССР—адм палітыч на палатне — 21 р. і без палатна — 3 р. СССР — адм палітыч., нямая — 21 р. СССР — фізіч — 18 р Аўстралія і Ціхі акіян — 18 р. Паўшар'е, нямая — 18 р. Афрыка фізіч. — 22 р. Палітыч. карта свету, нямая — 22 р. Тапаграфічная карта — 14 р. Паўшар'е Заходн. фізіч. — 14 р. Паўшар'е Усходн. фізіч. — 14 р. Еўропа фізічн., нямая — 20 р. Паўшар'е палітыч. — 18 р. Паўднёвая Амерыка — 15 р. Паўночная Амерыка — 15 р. Еўрапейская частка СССР, на палках — 15 р. Азія фізіч. — 26 р. Чэхаславакія — 3 р. Афрыка палітыч. — 6 р. і інш.
ГІСТАРЫЧНЫЯ КАРТЫ.
Еўропа XVII стагоддзя — 19 р. Драўняя Грэцыя — 17 р. Рымская імперыя — 20 р.
ГЛОБУСЫ.
Цана 7 р. 50 к. Розныя контурныя карты.
НАГЛЯДНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ.
Альбом па заалогіі — 13 р. 50 к. Карціны па гісторыі СССР — 3 р. Зона тайгі — 3 р. 50 к. Палярная зона — 3 р. 75 к. Перадача энергіі на адлегласць — 2 р. 50 к. Таблица Менделеева — 4 р. Шрыфты — і р. 60 к Карціны з свету жывёла — па 50 к. эка. Распаўсюджванне хімічных элементаў на вымной карты — і р. Літаратурныя табліцы ад 1 р. да 1 р. 50 к. Фотаальбомы класікаў (Пушкін, Некрасаў, Дабралюбаў, Чэхаў і інш.) ад 18 р. да 37 р. і розн. інш. наглядныя дапаможнікі.
ГЕАГРАФІЧНЫЯ КАРТЫ таксама ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх магазінах КОГІЗ'а ў гарадах БССР.



АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск Совецкая, 49. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдак гара — 21 352; намесніка рэдактара — 25 188; сакратарыята — 20-830; АДДЗЕЛАЎ: партыйнага — 21-353; совецкага будаўніцтва і гандлю—22-412; прамысловага — 21-356; сельска-гаспадарчага — 21-846; літаратуры, мастацтва, навукі і асветы — 23-855; мясцовай і замежнай інфармацыі 25-189, аддзел пісем — 20-844. 21-399. 21-885; ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры—21-556; заг. выдавецтва—21-358; аб'яў — 25-384.

Уп. Галоўлітбела № К-5639. Менск, друкарня «Звязды». Совецкая, 49. К., М., 6.